№ 15
(1558)

КУЛЬТУРА

9
красавіка
2022 г

Міністр культуры Анатолій Маркевіч і Ірына Аслоўскі (Аргентына)

Спрыяць Радзіме

На гэтым тыдні прайшла чарговая творчая стажыроўка кіраўнікоў замежных беларускіх калектываў мастацкай творчасці і кіраўнікоў грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа. Зладжаная яна была Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур, і гэтым разам у ёй удзельнічалі прадстаўнікі васьмі краін свету.

Асноўныя мерапрыемствы прайшлі ў Мінску, 4 красавіка, калі прывітаць удзельнікаў стажыроўкі завітаў міністр культуры Анатолій Маркевіч. Сустрэча праходзіла ў сімвалічным месцы — у сценах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, і ўвага ўдзельнікаў была звернутая на патрэбу захавання гістарычнай памяці.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Падчас экскурсіі беларусаў замежжа

У нумары

ЯНЫ БЫЛІ ПЕРШЫМІ...

Каму было наканавана лёсам сустрэць варожую зграю і не адступіць ні на крок? Дзе ўвекавечаны гэты бессмяротны подзвіг? Хто яны, гэтыя героі?

ст. 15

НЕАБСЯЖНЫЯ ГАРЫЗОНТЫ ТВОРЧАСЦІ

Мастацкі каледж імя Глебава сёлета адзначае 75-годдзе. Якіх слынных традыцый беларускай школы жывапісу прытрымліваюцца вучні і выкладчыкі знакамітай Глебаўкі?

ст. 7

ЗАКОНЫ, НАПІСАНЫЯ ПА-СВОЙМУ

Якімі былі беларускія правобразы Канстытуцыі?

ст. 14

KIMPRESS.BY

Алея народнай памяці

5 красавіка адбылася чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства. Дзякуючы сродкам відэасувязі, удзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Былі ўзнятыя пытанні добраўпарадкавання тэрыторый устаноў культуры і пасадкі расліннасці. Плануецца, што напрыканцы месяца супрацоўнікі апарата Міністэрства культуры прымуць удзел у закладцы алеі памяці ў Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці, дзе існуе мемарыял, прысвечаны трагедыі знішчанай вёскі Шунеўка. Тут, у 1943 годзе, гітлераўцамі былі забітыя мясцовыя жыхары.

Міністр заклікаў да правядзення аналагічных акцый ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Таксама разглядаўся ход работ па арганізацыі музейнымі ўстановамі выставаў, прысвечаных тэме генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя часовых экспазіцый, музейнымі і бібліятэчнымі ўстановамі будуць ладзіцца і краязнаўчыя лекцыі для навучэнцаў школ і ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па азначанай тэматыцы. У найбліжэйшым часе плануецца правядзенне тэматычнага рэспубліканскага семінара для навуковых супрацоўнікаў музеяў з удзелам прадстаўнікоў Генеральнай пракуратуры і Міністэрства адукацыі.

Адказы з Міністэрства

Што вас турбуе?

"К" працягвае публікаваць адказы на пытанні і прапановы, якія паступілі да супрацоўнікаў Міністэрства культуры падчас правядзення адзіных дзён інфармавання ў рэгіёнах краіны.

1. У Рэспубліцы Беларусь існуе трохступеністая сістэма музычнай адукацыі: школа мастацтваў — каледж — ВНУ, што дае магчымасць падрыхтоўваць высокапрафесійных спецыялістаў. У сувязі з працэсам аптымізацыі ў сістэме адукацыі, ці будзе захавана дадзеная сістэма?

Нягледзячы на праведзеную ў краіне ў мінулым годзе аптымізацыю і рэарганізацыю некаторых навучальных устаноў, падпарадкаваных Міністэрству культуры, у 2022 годзе захаваецца існуючая сістэма.

2. У сувязі з падрыхтоўкай да прыёмнай кампаніі ў сярэднія спецыяльныя ўстановы адукацыі ў 2022/2023 годзе, ці плануецца разгледзець пытанне аб павелічэнні колькасці творчых спаборніцтваў, якія даюць права паступаць ва установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі творчай накіраванасці без уступных іспытаў?

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 года № 263 зацверджаны пералік пэўных міжнародных і рэспубліканскіх цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

У пераліку выкладзены конкурсы, якія могуць даваць права паступлення ва ўстановы адукацыі ў сферы культуры без уступных іспытаў. У прыватнасці ў Міністэрства адукацыі будзе накіравана хадайніцтва аб узгадненні конкурсаў: "Музыка надзеі", Міжнародны конкурс піяністаў "Мінск — 2021", Рэспубліканскі адкрыты конкурс выканаўцаў на аркестравых інструментах імя Я.А.Глебава, якія дадуць магчымасць паступіць без экзаменаў у бягучым навучальным годзе.

Рэспубліканскі адкрыты мастацкі конкурс імя М.Савіцкага адбудзецца ў лістападзе 2022 года і дасць магчымасць паступаць у 2023 годзе таксама без уступных іспытаў.

Указ № 23 (ад 27.01.22) захаваў пазіцыі, якія даюць права паступаць у 2021/2022 навучальным годзе без уступных іспытаў, за выключэннем асоб, якія паступаюць у адпаведнасці з дагаворам аб мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй:

- пераможцы (Гран-пры, дыпломы I, II, III ступені) міжнародных і рэспубліканскіх творчых конкурсаў і фестываляў, алімпіяд у сферы культуры, праведзеных Міністэрствам культуры ў год прыёму або у годзе, які папярэднічае году прыёму, у парадку і згодна з пералікам, якія ўстанаўліваюцца Міністэрствам культуры па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі — пры паступленні на спецыяльнасці напрамкаў адукацыі «Мастацтва выяўленчае. Мастацтва дэкаратыўна-прыкладное", "Мастацтва музычнае", "Мастацтва сцэнічнае і экраннае", "Народная творчасць", якія адпавядаюць намінацыям творчых конкурсаў і фестываляў, алімпіяд у сферы культуры;

- асобы, узнагароджаныя ў год прыёму або на працягу двух гадоў, якія папярэднічаюць году прыёму, нагрудным знакам "Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі" за творчыя дасягненні ў сферы культуры, якія адпавядаюць выбранаму профілю (напрамку) адукацыі.

Пры паступленні на спецыяльнасць "Харэаграфічнае мастацтва" (накірунак спецыяльнасці "Бальны танец") асобам, якім нададзена спартыўнае званне "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь" па відзе спорту "Танцавальны спорт", выстаўляецца вышэйшы бал, устаноўлены для ацэнкі вынікаў уступнага іспыту па дысцыпліне "Творчасць".

Газета — рэгіёны — чытач

За часы існавання незалежнай Беларусі ўзнікла пытанне па рэстытуцыі, або вяртанні на гістарычную радзіму, музейных каштоўнасцей. Безумоўна, адным з самых яскравых сімвалаў Беларусі, якія засталіся з мінулых часоў, з'яўляюцца Слуцкія паясы. Што мяркуюць аб іх рэстытуцыі ў Слуцкім краязнаўчым музеі?

Наталля Серык, дырэктар Слуцкага краязнаўчага музея:

— Я добра стаўлюся да ідэі вяртання гістарычных каштоўнасцей, у прыватнасці Слуцкіх паясоў, у Беларусь. Галоўным пытаннем тут я бачу спосаб вяртання экспанатаў. Лічу, што з музеяў падобныя каштоўнасці вярнуць амаль нерэальна, хіба з дапамогай на самым высокім палітычным узроўні. І нават так: музеі могуць запатрабаваць паўнавартасны абмен на іншы экспанат. З прыватных калекцый, дзе таксама ўтрымліваюцца паясы, іх можна выкупіць, але за вельмі вялікія грошы. Ведаю, што паясы захоўваюцца ў музеях Масквы, Варшавы, Львова. Таксама і ў беларускіх музеях: Мінску, Маладзечне, вось і ў нас.

Важным гістарычным і культурным аб'ектам краіны, якому зараз патрэбна рэстаўрацыя, з'яўляецца Праабражэнская царква на тэрыторыі полацкага Еўфрасіньеўскага манастыра. Вядома, што праца тут адбываецца даўно з улікам дбайнага падыходу да гэтага храма сярэдзіны XII стагоддзя. Як сёння вядзецца рэстаўрацыя?

Галіна Бельская, дырэктар Упраўлення капітальнага будаўніцтва горада Полацка:

— Сёння мы з расійскімі калегамі вядзём рамонтна-рэканструкцыйныя работы на Спаса-Праабражэнскай царкве пад наглядам спецыялістаў з Міністэрства культуры. Нашыя партнёры цалкам займаюцца фрэскамі, мы на дадзеным этапе — кансервацыйна-супрацьаварыйнымі мерапрыемствамі. Падобны аб'ект патрабуе пільнага падыходу. Напрыклад, зімой работы праводзіць тут нельга, у царкве адбываюцца святочныя малітоўныя службы, што мы таксама мусім улічваць. Дарэчы, увага да археалагічных дэталяў дазволіла ў 2019 годзе знайсці тут пячатку Еўфрасіні Полацкай. Наша арганізацыя бачыць сваю галоўную місію ў тым, каб не нашкодзіць гістарычнаму аб'екту, а таксама разумна і эканомна ставіцца да бюджэтных сродкаў. Тым не менш работы, якія пачаліся ў 2011 годзе па рамонце будынка царквы з нашага боку, плануем скончыць у 2024 годзе.

Па вялікім рахунку, мы ўсе зацікаўленыя падтрымкай айчыннай кінаіндустрыі і забеспячэннем кінапракату відовішчнымі айчыннымі і замежнымі фільмамі. Як у рэгіёнах запатрабавана дзейнасць кінатэатраў?

Ірына Рамановіч, дырэктар кінатэатра "Юбілейны" горада Беразіно:

— Мы імкнёмся абнаўляць рэпертуар рознымі фільмамі, і абавязкова айчыннымі, але ідуць гледачы, вядома, на разрэкламаванае, тое, што на слыху. Для школьнікаў усіх узростаў мы праводзім кіналекторыі, дзе разам з беларускімі фільмамі паказваем прафілактычныя і ідэалагічныя ролікі. Лічу, што айчыннае кіно цікавае і якаснае, асабліва калі створанае на злабадзённыя тэмы. Жыхары нашага горада могуць выбіраць тыя кінастужкі, якія ім цікавыя, а мы падтрымліваем іх імпэт і імкнёмся сустрэць гледачоў розных узростаў і жанравых густаў.

Падрыхтаваў Павел САЛАЎЁЎ

Да ведама нашых чытачоў

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Культура і мастацтва» праводзіць работу па распрацоўцы новага сайта — інфармацыйнага партала "КіМ".

Мы плануем на адной інтэрнет-пляцоўцы сабраць максімальна карысную і разнапланавую інфармацыю, датычную сферы культуры і мастацтва.

Таму былі бы ўдзячны, калі б вы, паважаныя чытачы, унеслі свае прапановы на гэты конт.

Чакаем вашых водгукаў:

kultura@tut.by

art_mag@tut.by

Да 100-годдзя Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта ля брамы яго галоўнага корпуса з'явілася скульптурная кампазіцыя "Студэнт і студэнтка". У аздабленні фігур можна ўбачыць дэталі, якія сведчаць аб прыналежнасці да спецыяльнасцей БНТУ. Таксама ва ўбор фігуры Студэнткі ўключаны знакамітыя краявіды Мінска, у ліку якіх Ратуша, галоўны корпус БНТУ і знакаміты корпус-карабель на ўсходзе сталіцы. Над кампазіцыяй працавалі Армэн Сардараў і Аляксандр Фінскі.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Спрыяць Радзіме

Пачатак на стар. 1

ЗІРНУЦЬ У ВОЧЫ АДНО АДНАМУ

Дваццаць восем беларусаў з Аргенціны, Арменіі, Іарданіі, Латвіі, Літвы, Расіі, Украіны і Эстоніі сабраліся на гэтым тыдні ў сталіцы нашай радзімы, каб бліжэй пазнаёміцца з нацыянальнымі традыцыямі, вывучыць беларускія песні і танцы, асвоіць навыкі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Але спачатку ўдзельнікаў стажыроўкі чакала пагружэнне ў гісторыю роднай краіны — у Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны для іх зладзілі аглядную экскурсію па ўсёй экспазіцыі і цягам гадзіны падрабязна распавялі аб асноўных этапах змагання супраць нацызму і ўнёску беларусаў у перамогу над ім.

ПАДСУМАВАННЕ ПОСПЕХАЎ

Як адзначыў Анатолій Маркевіч, тыднёвая стажыроўка дазваляе ў большай ступені пагрузіцца ў атмасферу нашай краіны, у свет айчыннай культуры і пераняць цікавыя напрацоўкі, якімі нашы госці здолеюць падзяліцца з іншымі беларусамі замежжа. У рамках сустрэчы адбылося ўзнагароджанне найбольш актыўных прадстаўнікоў беларускай дыяспары за шматгадовую плённую дзейнасць па захаванні і папулярызацыі беларускай нацыянальнай культуры.

Узнагароды з рук Міністра культуры Анатолія Маркевіча атрымалі васьмёра ўдзельнікаў стажыроўкі. Нагрудным знакам Міністэрства культуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" адзначаная кіраўнік Самарскай абласной грамадскай арганізацыі беларусаў і выхадцаў з Беларусі «Руска-беларускае братэрства 2000» Ірына Глуская, якая таксама з'яўляецца ініцыятарам стварэння беларускіх вакальна-харэаграфічных калектываў — вакальных ансамбляў "Сузор'е" і "Каданс", узорнага дзіцячага вакальнага ансамбля "Зачараванне", харэаграфічных ансамбляў "Сябры" і "Мазаіка".

Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры былі ўзнагароджаныя старшыня рэгіянальнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Карэліі, кіраўнік мясцовай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Петразаводска Святлана Барташэвіч, кіраўнік беларускага культурнага таварыства "Лёс" у Таліне Таццяна Ніжнік, кіраўнік спецыялізаванага фонду спрыяння развіццю расійска-беларускага супрацоўніцтва "Белыя росы" з Санкт-Пецярбурга Ірына Рогава і кіраўнік Цэнтра беларускай культуры, старшыня беларускага культурна-адукацыйнага таварыства "Уздым" з Даўгаўпілса Жанна Раманоўская.

Граматамі Міністэрства культуры таксама адзначаныя старшыня валгаградскай грамадскай гарадской арганізацыі "Зямляцтва беларусаў" Віктар Зіновіч і першы правамоцны ўдзельнік сацыяльна-культурнага і спартыўнага клуба "Усход" у аргенцінскім горадзе Берыса Ірына Аслоўскі. Дарэчы, апошняя згаданая наша госця нават не валодае ні беларускай, ні рускай мовамі і ў Мінску карысталася паслугамі перакладчыка, але, тым не менш, памятае аб тым, што яе бабуля паходзіла з Гродзеншчыны, і з гонарам прадстаўляе беларускую культуру за акіянам. Клуб "Усход" дзейнічае ў Аргенціне ўжо больш за восемдзесят год, за што таксама быў ушанаваны граматай Міністэрства культуры.

АД УКРАІНЫ ДА ІАРДАНІІ

Сярод удзельнікаў стажыроўкі — жыхары як далёкіх экзатычных краін, так і прадстаўнікі суседніх дзяржаў, але ўсіх іх аб'ядноўвае безумоўная любоў да Беларусі. Заслужаны дзеяч эстраднага мастацтва Украіны, дарадца старшыні Усеўкраінскага саюза беларусаў па пытаннях культуры, нацыянальных традыцый і народнай творчасці, кіраўнік народнай студыі эстраднага вакалу "Соняшнік" Алена Аляксеенка з Міргарада, што ў Палтаўскай вобласці, прызнаецца, што творчая стажыроўка зрабілася для яе добрай нагодай яшчэ раз наведаць радзіму. Ва Украіне наша суразмоўца апынулася трыццаць год таму, калі стварыла сям'ю, але сёння яна часта наведвае Беларусь. У студыі "Соняшнік" дзеці выконваюць песні на самых розных мовах свету, і ў тым ліку — на беларускай. Таму, вядома, любы візіт беларускіх дэлегацый у Міргарад не абыходзіцца без выступу выхаванцаў гэтага калектыву.

А вось Аксана Чамеза, якая завітала ў Мінск з горада Аман, прадстаўляе Культурна-асветнае аб'яднанне беларусаў Іарданіі, якое дзейнічае ўжо на працягу трох год і налічвае каля трыццаці дарослых удзельнікаў, а таксама прыкладна столькі ж дзяцей. Вялікая ўвага надаецца тут захаванню гістарычнай памяці. Так, да Дня Перамогі штогод ладзіцца міжнародны літаратурны праект пад назвай "І сцерці памяць час ніколі не павінен: чытаем па-беларуску", у рамках якога ствараюцца відэаролікі, дзе прадстаўнікі дыяспары чытаюць літаратурныя творы беларускіх аўтараў на тэму Вялікай Айчыннай вайны.

Таксама аб'яднанне праводзіць конкурс дзіцячага малюнка паводле матываў беларускіх казак пад назвай "З рога ўсяго многа", ладзіць вечарыны, прымеркаваныя да такіх традыцыйных свят, як Купалле або Каляды, супрацоўнічае з музеямі і ўдзельнічае ў выставачных праектах. У планах на перспектыву — падрыхтоўка візіту ў Іарданію прадстаўнікоў нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" і арганізацыя выставы беларускага народнага касцюма.

У рамках творчай стажыроўкі яе ўдзельнікі цягам тыдня наведалі Нацыянальную бібліятэку Беларусі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Храм-помнік у гонар Усіх Святых. Падчас выезду ў Гомельскую вобласць нашы госці наведалі Веткаўскі музей стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, а таксама Стаўбунскі сельскі дом культуры і Неглюбскі сельскі цэнтр ткацтва, дзе змаглі бліжэй пазнаёміцца з рознымі відамі народнай творчасці і паўдзельнічаць у майстар-класах. Будзем спадзявацца, што традыцыя такіх сустрэч, запачаткаваная яшчэ ў 2016 годзе, будзе працягвацца і далей, спрыяючы міру і ўзаемаразуменню паміж народамі.

Антон РУДАК

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Меркаванне падпісчыкаў

Гэта мая газета

Мікалай Гайба, старшы навуковы супрацоўнік Дома-музея Адама Міцкевіча (г. Навагрудак):

— У сферы культуры я працую з 1991 года і памятаю яшчэ першыя нумары газеты "Культура", якая пачала выходзіць з таго ж года. Ад таго часу газета заўсёды на працоўным стале.

У газеце праглядваю ўсе старонкі, бо ў кожнай рубрыцы ёсць свае цікавосткі. Чытаю старонкі "На людным месцы", "Славутыя землякі" "Гістарыёграф", "Праекты развіцця". Часта тут сустракаю фота і станоўчыя замалёўкі пра сваіх знаёмых. Газета друкуе грунтоўныя артыкулы пра жыццёвыя шляхі нашых знакамітых землякоў, пра падзеі нашай гісторыі — таму многія нумары газеты ўжо запісаны ў фонды нашага музея.

Вольга Пляшэвіч, дырэктар Ляхавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы:

— Кожны раз, разгортваючы тую ці іншую старонку газеты "Культура", я вельмі ўважліва яе праглядваю. Менавіта гэта захавалася ў мяне з той пары, калі я, малады пачынаючы бібліятэкар-бібліёграф Ляхавіцкай РЦБС, упершыню па-сапраўднаму ацаніла і адзначыла для сябе газету "Культура". Прайшлі гады, але гэта пачуццё засталося ў мяне і па сённяшні дзень. Кожная рубрыка газеты прыцягвае вока чытача. Мне ў ёй падабаецца ўсё.

Асабліва хочацца адзначыць рубрыку "Суайчыннікі", "Гістарыёграф", "Праекты развіцця", "На людным месцы", "К" інфармуе". Але мне як кіраўніку бібліятэчнай справай было б вельмі прыемна бачыць на старонках газеты больш сучасных цікавых праектаў, якія б адпавядалі напрамку ў рабоце бібліятэк.

Апытанне месяца!

Калі б я быў(-ла) міністрам культуры Беларусі, то...
(дапішыце)

Нашы чытачы могуць пад сваім імем або ананімна даслаць у рэдакцыю прапановы, якія б яны перш-наперш ажыццявілі, калі б узначальвалі Міністэрства культуры.
Самыя цікавыя і канструктыўныя з іхбудуць надрукаваныя ў газеце і на сайце.
Адрас электроннай пошты:
kultura@tut.by
або звяртайцеся па тэлефонах
+375 29 294 72 43,
8 017 203 75 74
Чакаем вашы прапановы!

Кожныя выходныя, калі дазваляе надвор'е і абставіны, мы выбіраемся ў вандроўкі па гістарычных мясцінах. Часам, каб зрабіць тое-сёе "адкрыццё". А часам, каб наведаць аб'екты, якія добра вядомы, і за лёсам якіх мы сочым ўжо шмат год. Да такіх, безумоўна, адносіцца вёска Грушаўка, што на Берасцейшчыне, у якой ужо некалькі год запар ідуць рэстаўрацыйныя працы. Каб даведацца пра навіны рэстаўрацыі, убачыць перамены, гэтымі выходнымі мы адправіліся менавіта туды. А каталізатарам выезду сталі словы, пачутыя ад мясцовых жыхароў — "Грушаўку вы і не пазнаеце".

Сядзібны будынак 1890-х гадоў

Нераскіданае гняздо Рэйтанаў

як аднаўляецца котлішча славутага роду ў Грушаўцы

САМ-НАСАМ З УСПАМІНАМІ

Гэтым разам я ішоў у Грушаўку адзін. Хацелася няспешна абысці ўвесь комплекс. Дарэчы, даволі вялікі па тэрыторыі. Ну, і вядома ж, абавязкова дабрацца да капліцы-пахавальні Рэйтанаў у Грушаўцы (не блытаць з капліцай Рэйтанаў у Ляхавічах), да якой ад сядзібы каля кіламетра, калі б ляцець "як страла".

Уласна кажучы, першы выезд рэдакцыі "К" у Грушаўку адбыўся падчас Рэспубліканскага суботніка ў красавіку 2013 года. Мой візіт адбыўся туды на некалькі гадоў раней. Тады ніхто не паверыў бы, што праз нейкія 10-12 год, малавядомая ў Беларусі вёска Грушаўка пераўтворыцца ў "месца паломніцтва". І не толькі беларусаў. Бо расіяне ды прадстаўнікі іншых народаў , якія цікавяцца гісторыяй нашай краіны, адмыслова наведваюцца на радзіму Тадэвуша Рэйтана. Забытага героя, якога не заўсёды ведаюць нават некаторыя нашы гісторыкі.

На пачатку 2000-х у Грушаўцы многае было па-іншаму. Флігелі паабапал сядзібнага будынка стаялі ў хмызняку. Гэтак званая "Мураванка" (цагляны будынак другой паловы XVII стагоддзя, яшчэ дарэйтанаўскі), стаяла фактычна без даху. Галіны клёнаў, якія разрасліся за шмат гадоў, хаатычна ахутвалі і драўляны сядзібны дом, і руіны бровара. Праўда, свіран, унікальны грушаўскі свіран XIX стагоддзя, быў у такім стане, што можна было ў ім уладкавацца на "летнія кватэры". Кароўнік 1909 года актыўна выкарыстоўваўся па прызначэнні. А вось стайня, зарослая клёнамі і бярозамі, паціху разрабоўвалася мясцовымі жыхарамі, якія бралі там металёвыя швелера пачатку XX стагоддзя, бляху з даху і таўшчэзны брус. Калі праматаць некалькі год, як кадры стужкі, то мусім сказаць, што суботнікі, летнікі, фестывалі, вечарыны з выставамі праводзіліся і дзяржавай, і валанцёрамі. Дарэчы, мерапрыемствы ладзіліся не толькі ў Грушаўцы, але па ўсёй Беларусі. І мелі на мэце захаваць Грушаўку і папулярызаваць гісторыю роду Рэйтанаў. Так і адбылося, і зараз з кожным годам справа ідзе наперад.

ЯК ПТУШКА ФЕНІКС

Пра тое, як распачалася і вялася рэстаўрацыя сядзібы і капліцы, мы неаднаразова пісалі ў "К". Апошнія публікацыі на гэты конт былі ў пачатку 2020 года. Потым рэстаўрацыйныя працы на нейкі непрацяглы час спыніліся, але, не так даўно, аднавіліся ізноў.

Што ж было зроблена нашай дзяржавай за 2021 і пачатак 2022 года? Мы запыталіся пра гэта ў начальніка аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Ляхавіцкага райвыканкама, спадарыні Ніны Прыхач. Аказалася, значная частка таго, што прадугледжвала першая чарга рэстаўрацыі комплексу, ужо зроблена. Што тычыцца капліцы ў Грушаўцы, то сёлета яе дах атрымаў новае бляшанае пакрыццё. Дах сядзібы, які ў момант яе пабудовы ў 1890-х, спярша быў крыты гонтай, а пазней перакрыты бляхай, сёння ізноў накрыты гонтай. Перад гэтым адбылося ўзмацненне нясучых канструкцый. На першым і другім паверхах устаўлены вокны і дзверы. Ганак сядзібы, і з параднага, і з тыльнага бакоў, амаль прыведзены да ладу. На ганках усталяваны драўляныя калоны, выраблены па ўзорах, якія захаваліся, дзякуючы мясцовым жыхарам. Адноўлены і ўжо часткова атынкаваны ўваходы ў сутарэнні (якія, як я памятаю, знаходзіліся ў аварыйным стане). Што ж датычыцца саміх сутарэнняў, то тая палова, якая згодна з праектам прадугледжвала размяшчэнне тут мастацкай школы і музейнай экспазіцыі, амаль завершана. Для яе закупаецца абсталяванне, камп'ютарная тэхніка і мэбля. У маі запланаваны двухдзённы летнік, для ўдзельнікаў якога закуплена ўсё неабходнае.

Варта дадаць, што сёння аднаўленне Грушаўкі адбываецца дзякуючы выключна беларускай дзяржаве. Думаецца, што ў гэтым ёсць свой справядлівы сімвалізм. Сваё трэба адбудоўваць самім. І ёсць таму добрыя прыклады — сядзіба Напалеона Орды на Берасцейшчыне, або капліца Арэшкаў на Гарадзеншчыне, пра якія мы не так даўно распавядалі. Заўсёды прыемна ведаць, што аднаўленне такіх важных для нашай гісторыі і культуры месцаў адбываецца не без дапамогі мясцовай і рэспубліканскай улады. І мне падаецца, што завяршэнне сёлета першай часткі рэстаўрацыі і правядзенне ўлетку на грушаўскім падворку фестывалю традыцыйнай культуры "З крыніц спрадвечных" нездарма запланаваны ў Год гістарычнай памяці.

У ЯКАСЦІ "POST SCRIPTUM"

На зваротным шляху, наведаў я Ляхавічы. Там, на старых могілках, з 1796 года, хавалі прадстаўнікоў роду Рэйтанаў. Тут знайшлі апошні спачын браты Тадэвуша, пляменнік, і стрыечны ўнук з жонкай. На вялікі жаль, вытанчаная капліца некалькі год таму абрынулася. Але месца, дзе магчыма быў перапахаваны і сам пан Тадэвуш, здаля можна пазнаць па велізарнай лістоўніцы, якая была пасаджана Рэйтанамі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Шкада, што гэта важнае месца даглядаецца, толькі намі, "турыстамі" з Мінска. Шкада, што і іншая капліца (роду Солтанаў), якая калісьці разам з Рэйтанаўскай складала важную адметнасць на гэтых могілках, таксама знаходзіцца ў занеяпадзе і выкарыстоўваецца сваякамі памерлых ляхавічанаў, на жаль, як месца складання рознага смецця. Магчыма, праз нейкі час я надрукую гісторыю гэтай галіны роду Солтанаў, якая можа мець тое-сёе дачыненне да... Адама Міцкевіча.

Завітаў я і ў Гарадзею, дзе роўна год таму, мы з невялічкай кампаніяй фактычна выкопвалі, калі можна так сказаць, "каменнае прысвячэнне" Адама Міцкевіча, зробленае калісьці гаспадыні маёнтка. Глыбока і надзейна невядома колькі дзясяткаў год таму камень быў схаваны пад зямлю дбайнымі гарадзейцамі. Сёння гэты артэфакт знаходзіцца на падворку мясцовага краязнаўцы Аляксандра Абрамовіча. І бліжэйшым часам мы плануем распавесці пра яго гісторыю з улікам розных здагадак, а таксама вынесем на ўсеагульнае абмеркаванне далейшы лёс гэтай каштоўнасці.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Мінск — Брэсцкая вобласць — Мінск

Унікальны свіран XIX ст.

Капліца-пахавальня Рэйтанаў (1910-я годы)

Даведка

Першыя згадкі пра вёску Грушаўку паходзяць з сярэдзіны XVI стагоддзя. Міхал Рэйтан набыў яе каля 1696 года, пасля смерці папярэдняга ўладальніка. Ад таго часу Грушаўка цягам двух стагоддзяў знаходзілася ва ўласнасці прадстаўнікоў гэтага славутага сваімі дзеячамі роду. Хутчэй за ўсё тут, блізу дня св. Тадэвуша (28 кастрычніка) 1740 года, прыйшоў на свет унук Міхала, славуты Тадэвуш Рэйтан.

“Сярод ураджайных раўнінных палёў ляжыць мястэчка Гавязна з прыгожай мураванай царквою, з прасторнай драўлянай карчмой, з панскім маёнткам непадалёку і з некалькімі падуладнымі яму вёскамі”, — напісаў у падарожных нататках Уладзіслаў Сыракомля. Сёння на карце Гавязну не адшукаць, хоць само паселішча не знікла. У савецкі час даўнюю назву змянілі, і ўжо трыццаць гадоў цягнецца дыялог аб вяртанні гістарычнага імя.

Царква Іаана Прадцечы

У пошуках Гавязны

Гавязною некалі называлі тры пункты ля гасцінца са Стоўбцаў на Нясвіж — маёнтак, вёску і мястэчка. Найменне гэтае засталося ў пісьмовых крыніцах. Першыя згадкі аб маёнтку адносяцца да другой паловы XVI стагоддзя, калі мясцовасць належала слуцкаму князю Яну Алелькавічу. У 1588 годзе ён прадаў маёмасць Мікалаю Крыштофу Радзівілу Сіротку, які пазней перадаў гаспадарчы двор і вёску кляштару нясвіжскіх бенедыкцінак. Пры заснаваным імі храме ўтварылася мястэчка. Калі ў савецкі час такую адміністрацыйную адзінку скасавалі, паўстала пытанне, як адрозніць населеныя пункты з ідэнтычнымі назвамі. У выніку вёску зрабілі Гавязной-1, а былое мястэчка — Гавязной-2.

Трэба адзначыць, што пасля ўстанаўлення савецкай улады прыйшлі змены, якія закранулі беларускую тапанімію. Спачатку зніклі назвы, якія асацыяваліся з рэлігіяй, потым — нібыта немілагучныя. У 1964 годзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР перайменавалі больш за трыста населеных пунктаў. Закранулі змены і Стаўбцоўшчыну: першая Гавязна стала Навапольцамі, другая — Вішняўцом. Пазней тагачасны старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама Іван Плахатнюк у мемуарах напісаў: “Мы, напэўна, зашмат на сябе ўзялі, калі сталі пераймяноўваць “немілагучныя” назвы некаторых вёсак. Урывацца ў гэты гістарычны пласт было недазвольнай дурасцю”.

Напэўна, былы чыноўнік зразумеў, што геаграфічныя найменні — важны культурны код. І змены ў тапаніміцы цягнуць за сабой самыя розныя змены, у тым ліку ў свядомасці.

РАСШЫФРАВАЦЬ КОД

Што да “немілагучнасці назвы”... Краязнаўцы прыводзяць шмат варыянтаў паходжання наймення Гавязна. Напрыклад, звязваюць яго са словам “гавець”. Гэтую версію дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Ігар Капылоў лічыць беспадстаўнай. Больш пераканаўчай яму падаецца меркаванне аб сувязі назвы са словам “гавяза” з батанічнага слоўніка. Але і тут ёсць нюанс: часцей геаграфічныя найменні ўтвараліся ад назваў дрэў, а не траў. Таму пакуль нельга сказаць, што код Гавязны расшыфраваны.

— Трэба разбірацца з этымалогіяй тапонімаў, а не проста скасоўваць немілагучныя назвы. Змяненні прыводзілі да збяднення гістарычнай спадчыны, знішчэння ўнікальных назваў, — тлумачыць Ігар Капылоў. — Напрыклад, пад Мінскам ёсць пасёлак Сонечны. Назва прыгожая, але пустая. Тапонімы мусяць быць матываванымі, адлюстроўваць асаблівасці мясцовасці, арганічна ўпісвацца ў моўную сістэму.

ШЛЯХ ДА ВЯРТАННЯ

Перайменаванне адразу выклікала заклапочанасць у мясцовых, а ў сярэдзіне 1980-х гадоў пачаў фарміравацца рух за вяртанне спрадвечнай назвы. Былі публікацыі ў раённай прэсе, былі абмеркаванні сярод старажылаў. Але ключавым, напэўна, стаў 1992 год. Тады журналіст Валерый Дранчук, родам з колішняга фальварка Гавязна, сустрэў былога школьнага дырэктара Івана Аніфера. Той заклікаў адстойваць гістарычнае імя мясцовасці. Валерый Аркадзевіч склаў адкрыты ліст да землякоў, дзе патлумачыў каштоўнасць гістарычнага наймення.

— Гэты ліст вельмі істотны, ключавы. Ён з душы вырваўся. Без усялякай маёй падказкі настаяцель мясцовай царквы айцец Серафім цалкам зачытаў яго перад прыхаджанамі. Як мне пераказвалі, людзі адгукнуліся: з'явілася нейкая папера, і яны пачалі збіраць подпісы за вяртанне назвы. Гэта падняло мяне і натхніла, — узгадвае Валерый Дранчук.

Далучыліся старажылы. Адмысловы зварот падпісалі былая настаўніца Яўгенія Платун, колішняя загадчыца крамы Алена Сяржант і іншыя вяскоўцы. На жаль, падпісанты пайшлі з жыцця, так і не дачакаўшыся станоўчага адказу. Пытанне аб вяртанні гістарычнай назвы разглядалі тройчы — у 1992, 2003 і 2004 гадах. Яго выносілі на разгляд сельскага і раённага Саветаў дэпутатаў, на грамадскае абмеркаванне. Органы мясцовага кіравання прыходзілі да рашэння: перайменаванне немэтазгоднае. Вядома, перад гэтым раіліся з мясцовымі. І большасць з іх падчас апытанняў выступіла за захаванне сучаснага наймення Вішнявец.

Але трэба разумець, што многія не засталі старой назвы: нехта нарадзіўся ўжо пасля перайменавання, нехта прыехаў з іншых мясцін. Напэўна, таму не падтрымалі парыў старажылаў. Думаецца, некаторыя выступалі хутчэй не супраць Гавязны, а супраць клопатаў — прыйдзецца ж дакументы мяняць, грошы траціць. Маю здагадку пацвердзілі размовы з мясцовымі. “Назва старая падабаецца, але трэба ж пашпарты рабіць новыя, дакументы на жылё...”

Можа, вяскоўцы з большай павагай паставіліся б да дарагога старажылам тапоніма, каб ведалі кантэкст? Але жыхары і прадстаўнікі мясцовай улады пакуль што трымаюць пытанне “на паўзе”. Хоць не было “працёўнікаў Гавязны” і на круглым стале, калісьці зладжаным у Доме культуры. Ды і на заключэнне Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў, якая ўхваліла прапанову аб вяртанні старой назвы, можна б было звярнуць большую ўвагу.

ЯКОЙ БУДЗЕ РАЗВЯЗКА?

Сёлета зноў паўстала пытанне аб вяртанні гістарычнай назвы. Валерый Дранчук звярнуўся на прамую тэлефонную лінію да раённай улады, нагадаў аб рашэнні Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў. Пазней атрымаў адказ за подпісам намесніцы старшыні райвыканкама Жанны Лысай: “Пытанне аб перайменаванні дэталёва прапрацавана двойчы ў 2003 і 2006 годзе. Па выніках праведзенага сельвыканкамам з удзелам прадстаўнікоў райвыканкама апытання мясцовых жыхароў пераважная большасць выказалася за захаванне існуючых назваў”.

Падчас паездкі на Стаўбцоўшчыну я чуў выказванні за цяперашнюю назву. Напрыклад, супрацоўніцы сельсавета нібы паўтарылі ліст райвыканкама: мы галасавалі за Вішнявец. Але сустрэў і тых, каму старое найменне дарагое. “Дык мае ж старэйшыя дзеці ў Гавязне нарадзіліся!” — усхвалявана прамовіла былая настаўніца Галіна Карсека. Супрацоўніца бібліятэкі Раіса Тулейка падзялілася: “Бацька мой нарадзіўся ў Халаімаўшчыне, а маці некалі жыла на хутары. І ўжо недзе яны спаткаліся, ажаніліся. Тата збудаваў хату ў Навапольцах. Там я і нарадзілася ў 1964 годзе, якраз калі нашу вёску перайменавалі. Гэта ж усё была Гавязна! Вырашылі, што не добра гучыць назва... Але ж у кожнага свае погляды. Пераважае ў людзей матэрыяльнае. Наконт вяртання назвы я спецыяльна не размаўляла, але асноўнай масе ўсё роўна, думаю. Ужо шмат адышло тых, хто Гавязну памятае. Гэта ж колькі гадоў таму было — як я нарадзілася. Амаль шэсцьдзясят гадоў, як назву змянілі”.

На нядаўнім пасяджэнні Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў чарговы раз падтрымала прапанову Валерыя Дранчука аб вяртанні гістарычнай назвы аграгарадку Вішнявец. З удзелам навукоўцаў рыхтуецца даведачная інфармацыя пра этымалогію і ўнікальнасць назвы Гавязна. З удзелам членаў Тапанімічнай камісіі і прадстаўнікоў Дзяржаўнага камітэта па маёмасці гэтыя звесткі данясуць органам мясцовага кіравання і жыхарам Вішняўца.

— У Год гістарычнай памяці пры рашэнні тапанімічных пытанняў асабліва важна кіравацца прынцыпамі гістарызму, захавання найменняў геаграфічных аб'ектаў, якія з'яўляюцца неад'емнай часткай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, — кажа кансультант упраўлення геадэзіі і картаграфіі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Ірына Бародзіч.

Ці прыслухаюцца да гэтых слоў на Стаўбцоўшчыне? Гавязна атрымала яшчэ адзін шанец. Паводле закона, рашэнне за мясцовымі органамі ўлады, якія павінны ўлічыць агульнадзяржаўныя інтарэсы, геаграфічныя і гістарычныя ўмовы, а таксама меркаванне грамадзян.

Даніл ШЭЙКА
Мінск — Стаўбцоўскі раён — Мінск
Фота аўтара

Даведка

Славутасць Вішняўца (Гавязны) — мураваная царква Іаана Прадцечы. Яна ўзведзена як уніяцкая ў 1742 годзе. Пасля скасавання уніі храм перадалі праваслаўным і крыху змянілі яго аблічча. Але аўтэнтычная архітэктоніка засталася, фрагментарна захаваліся прыкметы віленскага барока. Гэта адна з нямногіх цэркваў у акрузе, якая ніколі не зачынялася. Раней у храме зберагалася цудатворная Гавязнянская ікона Божай Маці, напісаная на дошцы ў срэбранай аправе з пазалочаным вянцом на галаве. Паводле падання, абраз паказаўся на дрэве тром сялянам, якія ішлі на паншчыну. Убачыўшы вобраз Божай Маці, яны доўга маліліся — і спазніліся на працу, за што былі пакараны аканомам. Таго паразіла слепата. Ён раскаяўся, прыйшоў да месца з'яўлення абраза і атрымаў вылячэнне. Аднойчы ікона знікла з храма, і далейшы лёс святыні невядомы. Ва ўсіх гістарычных дакументах і царква, і цудатворны абраз — Гавязнянскія...

Неабсяжныя гарызонты творчасці

Каб паступіць у Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Глебава, дзе конкурс складае каля 20 чалавек на месца, не дастаткова шанцавання. Маладым людзям, якія прыходзяць сюды пасля 9 класаў, трэба прайсці праз нялёгкі творчы ўнутраны іспыт, а значыць, ужо мець за плячамі адмысловае майстэрства. Затое тыя, хто пройдзе адбор, будуць вучыцца ў найлепшых выкладчыкаў, якія сумяшчаюць навацыі з традыцыямі беларускай школы мастацтваў. А ганарыцца Глебаўцы ёсць чым. Сёлета каледж адзначыць 75-гадовы юбілей.



Дырэктар каледжа Аляксандр Шантаровіч і малады выкладчык Анастасія Дзятлава

Вучаніца Паліна Шамагонава за мальбертам

> *Развівацца трэба заўжды, інакш пачынаецца стагнацыя. А сказаць, колькі часу трэба выдаткоўваць у дзень на творчасць вучню або майстру, немагчыма. Творчасцю трэба жыць, любіць яе, інакш не вытрымаць гэтага рытму...*
>
> Аляксандр ШАНТАРОВІЧ

Дырэктар каледжа Аляксандр Шантаровіч гатовы падзяліцца тым, як тут рыхтуюцца сустрэць юбілей. У найбліжэйшы час пройдзе канферэнцыя з удзелам дэлегацыі Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў імя Рэпіна. Плануецца запрасіць на дыялогавую пляцоўку і прадстаўнікоў мастацкіх школ краіны, усіх профільных каледжаў і ВНУ, Нацыянальнага інстытута адукацыі і Акадэміі навук, Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі. Будуць абмяркоўвацца праблемныя тэмы і перспектывы супрацоўніцтва, праводзіцца майстар-класы. Акадэмія імя Рэпіна, дарэчы, сёлета таксама юбіляр, адзначае 260 гадоў з дня заснавання.

"У канцы красавіка ў нас пачнуцца перасоўныя выставы, — расказвае Аляксандр Валер'евіч. — Да восені з лепшымі дыпломнымі працамі нашых выпускнікоў за апошнія 30 гадоў мы праедзем па ўсіх абласных гарадах. У чэрвені рыхтуецца рэтраспектыўная выстава выпускнікоў каледжа ў Нацыянальным мастацкім музеі. Таксама хутка стартуе міжнародны мастацкі конкурс "Красавік", на які любы ахвочы можа даслаць сваю працу. Ацэньваць і выбіраць найлепшыя з іх сёлета будзе прафесійнае журы пад кіраўніцтвам асабіста старшыні Саюза мастакоў Глеба Отчыка. Да сярэдзіны лета пройдуць пленэры навучэнцаў у гістарычна знакавых мясцінах краіны, пасля якіх іх работы будуць выстаўляцца на мясцовых пляцоўках.

Увосень чакаецца перформанс "Глеба" ў Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва, а таксама выстава графікі і плаката ў галерэі "Універсітэт культуры". Завершыцца святкаванне юбілею вялікім святочным канцэртам у Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

На жаль, не скончаны работы па будаўніцтве нашага корпуса на Багдана Хмяльніцкага, 5, таму пакуль мы арандуем будынак на Петруся Броўкі, 22. Плошчаў сёння ледзь хапае, бо ўсіх вучняў трэба забяспечыць майстэрнямі. З інтэрнатам таксама праблема, дамаўляемся, каб іншагародніх студэнтаў прымалі да сябе Акадэмія мастацтваў ды Універсітэт культуры.

Тым не менш, упэўнены, творчыя дысцыпліны, якія ў нас выкладаюцца, — дызайн, жывапіс, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, — адны з лепшых ў краіне. Выпускнікі нашага каледжа — плеяда народных мастакоў, што задалі планку, якую мы не маем права апускаць.

Сёння ў нас навучаецца 216 чалавек. У мінулым годзе мы выпусцілі траіх стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі: Галіну Пракапенка, Ілью Мурашку і Маргарыту Жукаву.

З майго пункта гледжання, сталым чалавек становіцца з наяўнасцю жыццёвага досведу, які накладзены на прафесійны. І тое, што нам здаецца дапушчальным у юнацтве, ужо пераасэнсоўваецца інакш у старэйшым узросце. Але развівацца трэба заўжды, інакш пачынаецца стагнацыя. А сказаць, колькі часу трэба выдаткоўваць у дзень на творчасць вучню або майстру, немагчыма. Творчасцю трэба жыць, любіць яе, інакш не вытрымаць гэтага рытму.

Тэндэнцыя апошніх 10 гадоў: вучыцца ў каледж прыходзяць збольшага дзяўчаты. Хоць у 50-70-я гады мінулага стагоддзя тут займаліся пераважна хлопцы, ды і практычна ўсе нашы мэтры — мужчыны. Тым не менш многія з дзяўчат праяўляюць сябе таксама вельмі здольнымі.

Беларуская мастацкая школа базіруецца на акадэмічных асновах. Хіба што на старэйшых курсах мы даем студэнтам крыху больш свабоды, магчымасці праявіць сябе. Я сам не мастак, хутчэй адміністратар у сферы адукацыі. Уся мая дзейнасць зараз накіравана на арганізацыю добрай працы каледжа, і гэта мне вельмі падабаецца.

Той моладзі, якая хоча вучыцца ў нашых сценах, я б па-

Мастак-выкладчык Андрэй Карпянкоў

раіў звярнуць увагу на нашыя падрыхтоўчыя курсы. Яны дапамогуць лепш зразумець сябе як асобу і сябе ў мастацтве. Але і тут трэба прайсці конкурсны адбор. Да прыкладу, на летнія курсы да нас запісалася больш за 400 чалавек, а ўзяць мы можам 50-60".

У каледжы, па словах Аляксандра Шантаровіча, вялікую ўвагу надаюць падбору педагогаў, якім трэба будзе прадаўжаць слаўныя традыцыі. Удалося пазнаёміцца з маладым спецыялістам Анастасіяй Дзятлавай. Цяпер мастацтвазнаўца заканчвае аспірантуру ў БДУКМ і рыхтуецца абараніць кандыдацкую дысертацыю пад кіраўніцтвам загадчыцы кафедры гісторыі мастацтваў універсітэта Алены Шаройкі. Анастасіі сапраўды падабаецца перадаваць веды вучням. Усім, хто хоча глыбей вывучыць хвалюючыя іх тэмы ў мастацтве, яна раіць звярнуцца да рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама часцей бываць у Нацыянальным мастацкім музеі.

А вось мастак і выкладчык жывапісу, малюнка і кампазіцыі Глебаўкі Андрэй Карпянкоў працуе тут ужо 12 гадоў. Сваю задачу ён бачыць у тым, каб дапамагчы кожнаму студэнту стаць тым, кім ён марыць. Агульнага рэцэпту, як працаваць з вучнямі, няма. Неабходна ставіцца да кожнага як да асобы, не глядзець пагардліва. Гэтаму вельмі добра дапамагае ўсведамленне таго, што мастацтва, якому тут вучаць, — гэта тое, што напрацавана чалавецтвам за тысячагоддзі. І выкладчыку, якога б узроўню ён ні быў, і студэнту трэба напрацоўваць майстэрства заўсёды. Андрэй Іванавіч прытрымліваецца гэтага прынцыпу, практыкуецца, большую частку часу праводзіць у сваёй майстэрні. І нават ловіць сябе на думцы, што выкладаць з кожным годам яму становіцца з аднаго боку цікавей, а з іншага — складаней, бо ўвесь час адкрываюцца новыя погляды і падыходы. У педагогіцы ён арыентуецца на мастака і выкладчыка Паўла Чысцякова, у якога вучыліся Рэпін, Сяроў і Урубель. А бліжэй за ўсё з майстроў пэндзля яму Рэмбрант, Мікеланджэла і Пікасо, у кожным з якіх Андрэй Карпенкаў адчувае творчую свабоду.

Вучаніца другога курса Паліна Шамагонава пацвярджае, што вучыцца ў Глебаўцы нялёгка, але творчыя прадметы, атмасфера дапамагаюць рухацца наперад у абраным кірунку. Яе любімы прадмет — жывапіс. Паліне падабаецца працаваць з колерамі, любімая тэхніка — акварэль. А вось выпускніца Таццяна Уласавец заканчвае вучобу з чырвоным дыплом. Бяссонных начэй у яе выпадку не было: дзяўчына разумела, што адпачынак і сон неабходныя для дасягнення добрых вынікаў. Дзяўчына разумее, што каледж імя Глебава адкрыў ёй мноства гарызонтаў.

Упэўнены, што вучняў Глебаўкі чакае цікавая творчая будучыня, бо яны вучацца сапраўды ў лепшых. І моладзь, якая звязала жыццё з мастацтвам у гэтых сценах, набудзе ўнікальны досвед і багаты ўнутраны свет.

Павел САЛАЎЁЎ
Фота аўтара

Як сталіцу ахутвае культура

Як у любой справе, галіне культуры для эфектыўнай работы патрэбны здольныя кіраўнікі. Сталіцы ў гэтым пашанцавала, бо на пасадзе начальніка ўпраўлення культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта вось ужо год знаходзіцца адзін з такіх спрытных адміністратараў — Віталь Брэль. У яго задачу ўваходзіць арганізацыя свят, разбор бягучых спраў, інтэнсіўная работа над упарадкаваннем разнастайных праектаў. Віталь Пятровіч спраўляецца, бо мае багаты досвед працы кіраўніком: пачынаў службу ў аддзеле па справах моладзі Першамайскага раёна Мінска, затым Мінгарвыканкама і Міністэрства адукацыі, пасля курыраваў сацыяльную сферу і працаваў першым намеснікам кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы.

"Мне як кіраўніку заўсёды, безумоўна, дапамагала адукацыя, — дзеліцца Віталь Пятровіч. — Скончыў я БДУКМ па спецыяльнасці "сацыяльны педагог і арганізатар культурна-масавай дзейнасці", а затым Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце і магістратуру пры ёй. Усё больш пераконваюся, што для адміністрацыйнай працы патрэбны сапраўды шырокі кругагляд. Уласна, пачаў я працаваць чыноўнікам адразу пасля арміі, якая, у тым ліку, прышчапіла якаснае стаўленне да працы, адказнасць. Па характары мне гэта падыходзіць".

Віталь Брэль расказвае пра тыя галоўныя пытанні, якім сёння трэба надаваць асаблівую ўвагу. Першае — установы адукацыі ў сферы культуры. У сталіцы іх 26, і трэба выбудаваць паміж імі больш спарадкаваную сістэму. Усяго адзін чалавек ад упраўлення культуры Мінгарвыканкама курыруе гэту справу, і, канешне, не заўсёды ўдаецца ахапіць і вырашыць усе праблемы. Таму Віталём Пятровічам прынятае рашэнне аб стварэнні прафарыентацыйнага цэнтра на базе Музычнага каледжа імя Глінкі, які будзе праводзіць маніторынг і аналітыку працы ўстаноў адукацыі, аказваць метадычную дапамогу. Сюды ўключаюцца і выхаваўча-ідэалагічныя пытанні, якія будуць прыняты спачатку ў Мінску, а потым, калі будзе дарэчна, і ва ўсёй рэспубліцы.

Другая надзённая справа — увага да тэатральна-відовішчных устаноў. Выяўлена, што не ўсе спектаклі карыстаюцца папулярнасцю ў гледача. Праз некалькі гадоў, здараецца, яны зусім не акупляюцца і спісваюцца. У Мінгарвыканкаме прапаноўваюць і падбор матэрыялу, які быў бы цікавы гледачу. Таксама працуюць над тым, каб вывесці тэатры на парытэтнае фінансаванне, але не абмяжоўваючы іх працы.

У музейнай справе найважнейшае пытанне — стварэнне інклюзіўнага асяроддзя. А ў гадавіну стагоддзя мастака Міхаіла Савіцкага, работы якога сёння выстаўлены ў музеі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальным мастацкім музеі, упраўленне культуры Мінгарвыканкама хоча аб'яднаць іх у адной часовай экспазіцыі, і калі ўсе зацікаўленыя бакі пойдуць нам на сустрач, мы ажыццявім гэтую ідэю. Асабліва гэта важна для гасцей сталіцы, якія змогуць атрымаць уражанне аб творцы, знаходзячыся ў адным месцы.

"Мы ставім задачы па пошуку сучасных ідэй і канцэпцый у правядзенні гарадскіх і рэспубліканскіх свят у сталіцы, шукаем рэжысёраў, якія маглі б прапанаваць для іх самыя смелыя ідэі, артыстаў, здольных іх рэалізаваць, — расказвае Віталь Брэль. — У бліжэйшы час адбудзецца Свята Перамогі і Дзень Незалежнасці, да якіх мы пачыналі рыхтавацца з пачатку года. У канцы мая ў нас на Ратушнай плошчы пройдзе традыцыйны летні музычны турыстычны сезон, дзе адбудуцца розныя творчыя праекты. Не забываемся мы і пра Дзень горада Мінска, якому сёлета споўніцца 955 гадоў.

Узгадняючы культурную праграму на любое з мерапрыемстваў, я стаўлю сябе на месца гледача, было б мне цікава паўдзельнічаць у ёй ці не. Калі адказ станоўчы, значыць, сумленне чыстае, і мы прадумалі ўсё да дробязей.

> *"Мы ставім задачы па пошуку сучасных ідэй і канцэпцый у правядзенні гарадскіх і рэспубліканскіх свят у сталіцы, шукаем рэжысёраў, якія маглі б прапанаваць для іх самыя смелыя ідэі, артыстаў, здольных іх рэалізаваць...*
>
> Віталь БРЭЛЬ

Вядома ж, кіруемся ў рашэнні разнастайных задач мы "Кодэксам аб культуры" — настольнай кнігай кожнага кіраўніка галіны. Безумоўна, добра, што Міністэрства культуры правяло па абнаўленні гэтага дакумента вялікую працу.

Ва ўпраўленні культуры Мінгарвыканкама людзей не так і шмат. І, вядома, у арганізацыі вялікіх праектаў падключаюцца і іншыя спецыялісты — "Мінскканцэрта", Палаца культуры, профільных устаноў адукацыі, бібліятэчнай сістэмы. Лічу, што самае складанае — распланаваць, задумаць святочнае мерапрыемства, а рэалізаваць яго на любой пляцоўцы, у любым горадзе — гэта ўжо справа тэхнікі.

Калі я рабіў першыя крокі на кіруючых пасадах, здавалася, што можна агарнуць увесь свет. Цяпер разумею, што кожнае рашэнне павінна быць выверанае, таму часцей раюся з калегамі. Але не трэба баяцца эксперыментаваць. Не раз пераконваўся, што самыя смелыя і, здавалася б, невыканальныя рашэнні могуць быць увасоблены, калі над імі сур'ёзна папрацаваць. З досведам можна навучыцца арганізоўваць любы працэс".

"Родам я з Чачэрска, але Мінск ужо ўвайшоў у маё жыццё, — працягвае Віталь Пятровіч. — У дзяцінстве я бываў у многіх гарадах, але больш за ўсё мяне ўражвалі Мінск і Ленінград. Калі ж пачаў працаваць у сталіцы Беларусі, мяне падкупіў яе рытм, я ўсё больш пранікаўся духам яе пастаянных падзей. Нават цяпер у шчыльным працоўным графіку я знаходжу час на розныя культурныя і спартыўныя мерапрыемствы, якія праходзяць тут. Да таго, як я прыйшоў на пасаду начальніка ўпраўлення культуры, стараўся як мага часцей, мінімум раз на месяц, бываць у тэатры. З апошніх пастановак запомнілася п'еса ў Музычным тэатры «Рамэа і Джульета праз 20 гадоў». Яшчэ ў Мінску выдатны цырк, які немагчыма не палюбіць. Жадаў бы завастрыць увагу мінчан на маіх улюбёных справаздачных канцэртах музычных устаноў адукацыі, бо пад выкладаннем таленавітых педагогаў здольныя навучэнцы кожны раз ствараюць асаблівую магію музыкі. Вядома, самым простым спосабам далучыцца да культуры можна праз чытанне. Сёння я ў чарговы раз перачытваю «Братоў Карамазавых» і адкрываю ў гэтай кнізе ўсё больш сэнсаў.

З'яўляючыся кіраўніком, які працаваў большую частку часу з моладдзю, адзначу, што ў нас яна вельмі таленавітая, творчая і патрыятычная. Я ўсімі сіламі імкнуся ўвасобіць досвед супрацоўніцтва з ёй у бягучым парадку дня. Бо калі пачынаеш крытыкаваць моладзь — мусіць, становішся старым. Моладзь шмат робіць, каб развіваць сябе і нашу краіну, моладдзю абавязкова трэба займацца, і нашае ўпраўленне будзе ствараць тыя культурныя ўмовы ў сталіцы, якія былі б карысныя і цікавыя ёй, ну і, вядома ж, усім мінчанам".

Павел САЛАЎЁЎ
Фота аўтара

Мацарціяна — 2:1

За апошнія некалькі месяцаў нашы оперныя спевакі тройчы звярнуліся да Моцарта: у Вялікім тэатры Беларусі паставілі яго зінгшпіль “Басцьен і Басцьена”, а ў опернай студыі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, дзе гэты зінгшпіль з’явіўся крыху раней, увасобілі таксама оперу “Дон Жуан”.

Творы Моцарта — заўжды іспыт для музыкантаў, бо патрабуюць асаблівай якасці гуку, яго лёгкасці і палётнасці, даведзеных да боскай дасканласці. Зварот спевакоў да моцартаўскага “россыпу бісерам” — цяжка дасягальная, падуладная далёка не ўсім, але вельмі неабходная частка прафесіі. У рэпертуары нашага Вялікага тэатра ёсць і “Вяселле Фігаро”, і “Чароўная флейта”, калісьці былі “Дон Жуан”, “Дырэктар тэатра”, а цяпер з’явіўся ранні твор кампазітара, напісаны ім у 12-цігадовым узросце: камічная опера

“БАСЦЬЕН І БАСЦЬЕНА”

Яе прэм’ера ў Камернай зале імя Л. Александроўскай была прыпадпесена як самастойны вячэрні спектакль. Але ж ставілася яна найперш для таго, каб завяршаць ёй экскурсіі па тэатры для дарослых і дзяцей. З’едліва яркія фарбы жудасна кіслотных адценняў, гратэскавыя, шаржыраваныя паводзіны герояў — рэжысёр Наталля Кузьмянкова і мастак Любоў Сідзельнікава свядома абралі эстэтыку поп-арту. Але ж у любым мастацкім кірунку ёсць творы больш густоўныя ды “смачныя”, а ёсць — менш. Спектакль патрапіў у другую групу. Бо немудрагелісты сюжэт пра пастушку, што з дапамогай вясковага ведзьмака-шарлатана вяртае свайго каханка, які пачаў заляцацца да гарадской прыгажуні, цяжкавата ўявіць у сучасным атачэнні, хай і з парадыйнымі штрыхамі. Як бы ні старалася канцэртмайстар Алена Алімпіева “расфарбаваць” фартэпіяннае гучанне, а паўнавартасна замяніць ім прадугледжаны ў арыгінале камерны аркестр — немагчыма. Праз некалькі арый-дуэтаў “раяль у кустах” пачынае надакучваць. Дый вакалам не насалодзішся ў поўнай меры: спевакам не хапае кантрастаў дынамікі, дэталізаванасці штрыхоў, агульнай выразнасці.

У опернай студыі Акадэміі музыкі спектакль з’явіўся крыху раней як вучэбная работа вакалістаў малодшых курсаў. Рэжысёр Ірына Гаранец і дырыжор Вячаслаў Ларын не сталі разбураць наіўную пастараль зменай эстэтыкі. Наадварот, тая толькі ўзмацнілася ўвядзеннем дадатковых персанажаў — невялічкага статка авечак. Не парадыйна цацачных, а гарэзлівых, крана льна мілых, увасобленых прыгажунямі-дзяўчатамі, якія сваімі “бе-бе-бе” жыва рэагавалі на падзеі, шчыра спачувалі героям і тым самым сталі злучным звяном не толькі між сцэнай і залай, але і між XVIII і XXI стагоддзямі.

“ДОН ЖУАН”

Гэта той яшчэ моцны арэшак. Памятаю, як некалькі гадоў таму ў нашым Музычным тэатры гэтую оперу збіраліся паставіць, ды ўрэшце адмовіліся. А студэнты — няўжо асілілі?

Будзем рэалістамі: эталоннага выканання, на якое раўняўся б увесь свет, не атрымалася. І не магло атрымацца! Заходняя тэхніка бельканта, калі правесці параўнанні з жывапісам, падобная да акварэлевых мініяцюр тоненькім пэндзлікам. У рускай жа вакальнай школе, пераемніцай якой стала сучасная беларуская, пераважаюць эмацыйна напоўненыя шырокія мазкі алеем, прыдатныя для эпічных палотнаў.

Як спалучыць адно з другім? Пастаноўчай канцэпцыяй. Ганна Маторная, літаральна днямі прызначаная галоўным рэжысёрам Вялікага тэатра, дала студэнцкаму спектаклю азначэнне “фантазія” і перанесла дзеянне ў сучаснасць. Таму некаторая экзальтацыя асобных сцэн стала адлюстраваннем ціперашняй маладзёжнай энергетыкі, падхопленай аркестрам на чале з дырыжорам Аляксандрам Высоцкім. Больш ці менш моцартаўскае гучанне

“Басцьен і Басцьена”

“Дон Жуан”

было хіба ў Цэрліны (пяцікурсніца Марыя Гладзікава), што адпавядала яе легкадумнай наіўнасці, змяшанай з прыродным какетствам. Страдаўнія паданні з іх містычным з’яўленнем статуі і смяротным поцісканм рукі Камандора абярнуліся рэальнасцю — праз надзвычай дэталёвыя ды трапныя псіхалагічныя дэталі, нададзеныя аднаму з найбольш умоўных жанраў, якім лічыцца опера.

Усе без выключэння героі атрымалі жывыя чалавечыя характары, што складаліся з неверагоднай сумесі рознапалярных рысаў — станоўчых і адмоўных. Дон Жуан паўстаў тыповым прадстаўніком “залатой моладзі”, які прызвычаіўся атрымліваць усё і адразу. Аблічча кітайскага магістранта Вана Цзясіня, аднаходлівыя манеры яго героя здымалі ўсе пытанні, чаму той карыстаецца жаночай прыхільнасцю: не заўважыць яго папросту немагчыма. А далей — дапамагаюць, як ні дзіўна, іншыя мужчыны, ушчэнт разбураючы дзявочыя чаканні. Той жа Мазета (Аляксей Апановіч з 4 курса) аказваецца хатнім тыранам, рэўнасць якога, памножаная на рукапрыкладства, узрастае з кожным кілішкам, атрыманым ад незнаёмай яму прыгажуні — маўклівай сяброўкі Лепарэла, якой у оперы Моцарта не было. Лепарэла (пяцікурснік Руслан Маспанаў) увогуле становіцца тут гэткім “шэрым кардыналам”: менавіта ён укладзе ў рукі Дон Жуана нож — і той заб’е ім Камандора (Уладзіслаў Зазулька, таксама з 5 курса), што кінецца на яго зусім не з халоднай зброяй, а са старэчым кіем.

Кожная з астатніх разгорнутых партый была падзелена між некалькімі выканаўцамі — прыблізна так, як бывае ў некаторых серыялах, дзе замена артыстаў пры неабходнасці ажыццяўляецца непасрэдна ў працэсе здымак. Клопат пра маладыя галасы і жаданне ахапіць большую колькасць студэнтаў надало дзеянню дадатковыя сэнсы. Калі трэцякурснікі Іван Бярэзін і Васіль Ліпскі па чарзе спявалі ў першай дзеі Дона Атавіа, у “недатыкі” Донны Ганны (пяцікурсніца Кацярына Максімава) аказалася нібыта двое залётнікаў-цёзак: чым не новы паварот? А ў другой дзеі Ганну з Атавіа ўвасаблялі Настасся Міхнавец і Канстанцін Бязродны, быццам падкрэсліваючы, што людзей, апантаных помстай, хапае. Гэтак жа, як хапае і энергетычных п’явак з імем, што праз гэту оперу стала назоўным: Донна Эльвіра. У Самары Засун яна атрымалася парадыйна імпульсіўнай бізнесвумэн. А ў Крысціны Мацюшонак, якая пасля антракту выйшла на замену, — нуднай плаксай.

Галоўная пастаноўчая загадка гэтай оперы — як намаляваць пагібель Дона Жуана. У праграмцы рэжысёр пазначыла, што яго, маўляў, пажыраюць полымя адплаты. На сцэне мы ўбачылі ці тое куклуксланаўцаў, ці тое прадстаўнікоў нейкай секты, якія цягнуць героя ў закулісе, ахопленае “полымем”, што праецыравалася на заднік.

Эксклюзіў? Яшчэ які. Але спектаклі опернай студыі Акадэміі музыкі застаюцца ў поўным сэнсе слова “адназразовымі”: выносяцца на публіку ўсяго адзін раз, максімум — два. Прычым у закрытым рэжыме, толькі для выкладчыкаў і студэнтаў навучальнай установы. Ці ж не крыўдна?..

Надзея БУНЦЭВІЧ

“Муха...” у оперу пайшла і прызнанне там знайшла

Маладзёжны тэатр эстрады ўсё больш паварочваецца ад шоу-праграм у бок мюзікляў ды іншых музычных спектакляў. Вясновыя канікулы ён завяршыў прэм’ерай шоу-оперы “Мухі-Цакатухі баль”.

Спектакль пазначаны ўзроставай катэгорыяй 0+, але яго без аніякіх ваганняў можна назваць сямейным. Дарослыя не толькі не засумуюць, але і знойдуць безліч дадатковых сэнсаў і дэталяў вядомай казкі Карнея Чукоўскага, пераказанай зусім інакш. Новае тут усё: сюжэтны разгорт з нечаканым фіналам, яркія, трапныя, папрыўдзе “мюзіклёвыя” вершы (аўтар лібрэта і рэжысёр — мастацкі кіраўнік тэатра Уладзіслава Арцюкоўская). Кідкая, запамінальная музыка артыста тэатра Аляксандра Сухарава. Не зусім звычайны жанр — не проста дзіцячая опера, а шоу-опера. Нязвыклае месца дзеяння — ля абажура лямпы: тая выпраменьвае святло, да якога і злятаюцца казуркі. Закранаюцца тэмы рэўнасці, шлюбнай вернасці, заніжанай самаацэнкі і, наадварот, нарцысізму. Муха закаханая ў Камара, ды не лічыць сябе яму роўнай. У Прусака ёсць жонка Прусачыха, ды ён заглядаецца на маладзейшых. Павук, спачатку надзвычай галантны (гэтакі інтэлігент у акулярах з адкрыта раманцтычным меладызмам), аказваецца вампірам-крывасмокам. І камарыная шабля яму не страшная. А вось гром нябёсаў з карным мячом маланкі (у пераносным і прамым сэнсах) — іншая справа.

Не засумуюць на спектаклі і музыканты. Бо шоу-опера аказваецца разнавіднасцю дзіцячай поп-оперы, лайт-оперы, заснаванай на полістылістыцы: тут ёсць рэп, іспанскія, лацінаамерыканскія павевы (асабліва ў каларытнага Майскага жука), простая інтанацыйнасць дзіцячых песень, фальклорных лічылак-заклічак, кантавай культуры. Фінал нагадвае жанравае адгалінаванне оперы выратавання: нечаканая пагібель Павука праз навальніцу паходзіць ад антычнага прыёму “бог з машыны”. І адначасова, дададзім, становіцца спасылкай да хрысціянскіх асноў казак Андэрсана.

Пасля пералічанага хтосьці засумняваецца: няўжо ўсё гэта — для самых маленькіх? Не хвалюйцеся, дзеці будуць заворожаныя найперш відовішчам, бо сцэнічныя строі Вольгі Грыцаевай — вышэй за ўсе пахвалы і пераўзыходзяць самыя неверагодныя фантазіі. Кожная казурка атрымалася цалкам пазнавальнай, максімальна набліжанай да рэалістычнага ўвасаблення праз коларавую гаму, габарыты касцюмаў, форму крыльцаў-вочак-лапак, іншых дэталяў. Пры гэтым захавалася тэатральная ўмоўнасць, памножаная на высокую мастацкасць. Таму спектакль вучыць не толькі сяброўству і іншым чалавечым адносінам, але і любові да прыроды, эстэтычнаму густу, уменню заўважаць вакол сябе прыгажосць.

Сцэны са спектакля

Драматургія шоу-оперы сумяшчае нумарную структуру са сцэнамі скразнога развіцця. Але музыка зусім не складаная. Невыпадкова адну з песень развучваюць з публікай, і дзеці ахвотна адгукаюцца. Прадугледжаны і гульні: двойчы цягам спектакля артысты закідваюць у глядзельную залу вялізныя надзьмутыя мячы ў выглядзе кавуноў, і дзеці весела, апантана шпурляюць іх адно адному.

Спектакль карысны і для самога тэатра, бо напоўніцу прэзентуе магчымасці калектыву ў стварэнні шоу-оперы і яе сцэнічным увасабленні, раскрывае творчы патэнцыял аўтараў і выканаўцаў. У пастаноўцы задзейнічаны як майстры айчыннай эстрады, так і творчая моладзь. “Мухі-Цакатухі баль” адкрывае новыя імёны, з нечаканага ракурсу дэманструе ўжо вядомых спевакоў і акцёраў. Мухай паўстала артыстка размоўнага жанру Марыя Іванова, якая аказалася добрай вакалісткай з надзвычай пачуццёвым, багатым па тэмбры мецца. Яе сяброўку Мошку ўпэўнена і кранальна сыграла зусім маладзенькая Паліна Арцюкоўская, скарыўшы лёгкім, свежым сапрана, падобным да срэбранага званочка. Аблічча прыгажуна Павука ўдала прымерыў Мікіта Касцюкевіч: раней ён спяваў у “Верасах”, а цяпер робіць сольную кар’еру, валодаючы глыбокім, аксамітным барытонам і мяккай прыцягальнай пластыкай. Насамрэч адзначыць можна ўсіх: кожны выступае і сольна, і арганічным удзельнікам спеўнаакцёрскага ансамбля і ўсёй творчай каманды. Як-ніяк, “... Баль”!

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Даведка

Марыя Сыракваш скончыла Мінскую дзяржаўную гімназію-каледж мастацтваў. У 2019 годзе паступіла ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў на аддзяленне графікі. Удзельніца і пераможца тэматычных конкурсаў. У 2022 годзе па выніках рэспубліканскай выставы “Графіка года’21” Марыя Сыракваш атрымала дыплом першай ступені.

Марыя Сыракваш

Цудадзейныя вандроўкі ў мінулае

Смаляны. Прывід (2021)

Некалькі дзён таму, завітаўшы ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, з афішы на ўваходзе я даведаўся, што 24 сакавіка ў галерэі “Панарама” адкрылася новая выстава — “Вандроўкі ў мінулае” маладой беларускай мастачкі Марыі Сыракваш.

Яваволі часта бываю на мастацкіх выставах. Але, калі па-шчырасці, вельмі рэдка творы нашых сучаснікаў пакідаюць мяне ўражаным. Іншая справа — працы Марыі Сыракваш. За апошнія два гады я бачыў яе творы ў Палацы мастацтва і Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. І кожны раз яны прымушалі мене спыніцца побач. Часам гэта былі велізарныя лінарыты, часам — акварэльныя пейзажы або нацюрморты. Працуе Марыя Сыракваш і ў інсталяцыі і алейным жывапісе. Мастацтвазнаўцы акрэсліваюць яе творчасць такімі словамі: “Бязважкасць, свежасць, атмасфернасць і празрыстасць уласцівы акварэлям мастачкі. Яе асаблівая палітра — жывапісныя колеры, упэўненыя лініі, абстрактныя вобразныя элементы, эмацыянальны кантэкст. Уяўны парыў ветру, рух травы, гульня святла на вежах, сакавітыя фарбы — акварэльныя пейзажы нібыта матэрыялізуюцца ў паветры і ўяўленні, прымройваюцца гледачам — настолькі насычаная кожная выява”.

Чым жа мяне ўразіла персанальная выстава і чаму б я параіў яе наведаць? Усё проста. Тут прадстаўлена каля 30 пейзажаў 2019—2021 гадоў. Гэта і старыя замкі, палацы, сядзібы, храмы і вёсачкі, прычым многія з іх добра вядомыя беларусам. Прыкладам, Крэўскі, Гальшанскі і Смалянскі замкі, касцёл у Івянцы, флігель у Медзвядцы (ледзь не адзінае, што засталося ад сядзібы, дзе 220 год таму нарадзіўся славуты навуковец-геолаг Ігнат Дамейка), сядзіба ў Грушаўцы (дзе нарадзіўся не менш вядомы гістарычны дзеяч часоў ВКЛ Тадэвуш Рэйтан) і многае іншае можна ўбачыць на выставе. Геаграфічна тут — уся Беларусь, Міншчына, і Гарадзеншчына, Берасцейшчына і Віцебшчына. Марыя Сыракваш — чалавек, якога без сумневу можна назваць “апантаны Бацькаўшчынай”. Пэўна, такім ж былі мастакі Напалеон Орда і Язэп Драздовіч. І яднае іх усіх тое, што кожны з іх быў “нон-стоп” вандроўнікам па роднай Беларусі. Орда аб’ехаў усё былое ВКЛ, карыстаючыся экіпажам. Драздовіч вымяраў прастору стаптанымі чаравікамі. А Сыракваш — больш сучасным відам транспарту: старым добрым роварам. Пра тое, што штурхае яе, узяўшы эцюднік, нягледзячы на надвор’е, ехаць на край зямлі, лепей за яе не адкажа ніхто: “*У дзяцінстве мы шмат вандравалі з бацькамі, і ў маёй падсвядомасці адбіліся выявы старых сядзіб і палацаў, капліц і храмаў, старых паркавых дрэў і пакрытых імхамі камянёў*”. Пазней мастачка не раз вярталася ў тыя мясціны , знаёмыя з дзяцінства. І бачыла, як людзі няўмольна, бяздумна сціраюць з зямлі тое, што не паспеў зрабіць час. Як знікаюць тыя палацыкі, як высякаюцца векавыя дрэвы. І тады да яе прыйшло разуменне, што адна з яе задач як мастака — захаванне гэтай нашай агульнай спадчыны. Хай і ў выглядзе рамантычных вобразаў. Але дарэчы сказаць, што адлюстроўвае мастачка і пазітыўныя змены, тыя ж вынікі рэстаўрацыі на замках і сядзібах. Так яе малюнкі атрымліваюць дадатковую, гістарычную вартасць.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 15 / 9 КРАСАВІКА 2022 г.

Калі за кожнай з'явай — Асоба...

Журналіст перастае быць журналістам, калі яму няма чаго сказаць свету. У такой прадвызначанасці — і асалода, і праклён. У кожнай з'яве шукаеш прадмет публіцыстычнага вывучэння. І амаль заўжды знаходзіш. Згадаўся, да прыкладу, якар у адным з прысожскіх раённых цэнтраў. Не як карабельны рыштунак, а як дарэчная інсталяцыя для гарадскога аздаблення. А побач з якарам з'явіўся чалавек, а за ім — тая самая з'ява. Інтрыга? Яна!

Удзельнікі Кірмашу талентаў з Мазалава. І Папандопула на месцы!

Чалавек стварыў свой, уласны музей якараў з бясплатным наведваннем. І на пачатку нашага агляду згадаць хачу пра прыватныя ўстановы культуры. А дакладней, пра першыя крокі, што робяць энтузіясты ў гэтым кірунку.

У ПОШУКАХ ПРЫЗНАННЯ

Так, ёсць пэўная колькасць апантаных уладальнікаў карцін, рэдкіх рэчаў, кніг, якія хочуць пераўтварыць свае зборы ў музей. Не дзеля ўзбагачэння, а для папулярызацыі мастацтва, прамысловага дызайну, літаратуры... Калі калекцыя і яе ўладальнік выходзяць з ценю невядомасці, яны ў разы падвышаюць сваю грамадскую значымасць. Пытанне, вядомае зацікаўленым асобам. Але і па сёння, наколькі ведаю, для афіцыйнай статуснасці такіх утварэнняў пакуль не стае заканадаўчага забеспячэння. Аднак прыватныя ўстановы культуры ёсць і маюць і пэўную славу, і сваіх наведвальнікаў. Карцінныя галерэі маю на ўвазе. Ды музеі, што месцяцца ў гаражах, ангарах, майстэрнях. Але распавяду пра прыватную бібліятэку, чытачом якой я калісьці быў.

ЧАЛАВЕК ЗРАБІЎ БІБЛІЯТЭКУ

Працаваў я калісьці слесарам на бавоўнапрадзільнай фабрыцы. Паказалі мне здаля яе галоўнага інжынера. Сказалі, што чалавек ён — вялікі. Я пасмяяўся: росту ў чалавека было крыху больш за паўтара метра. Праз час, калі працаваў у раённай газеце, мы не падзялілі з ім у шапіку Саюздруку кніжку Сэленджэра. Ён мне яе ўрэшце саступіў, мы пазнаёміліся, я стаў называць гэтага сапраўды вялікага чалавека дзядзька Міша.

Па абавязку службы ён ведаў усе маркі жалеза і чыгуна, гатункі вугалю і нумары падшыпнікаў. Але гэта далёка не ўсё. Дзядзька Міша разбіраўся ў яхтах і сабаках, у зброі і беларускіх дыялектах, у сусветным і айчынным літаратурных працэсах. Словам, ён ведаў пра тое, пра што я ўвогуле не чуў. А яшчэ ў яго была хатняя бібліятэка, бо ён усё жыццё збіраў кнігі.

ЗАМЕСТ ПЛАТЫ — РАЗМОВА

Паліцы закрывалі сцены да столі ва ўсіх чатырох пакоях. Асобна стаялі англасаксы і раманцы. Свае стэлажы прызначаліся для беларускай літаратуры. Індывідуальную "прапіску" мелі прыгоды і фантастыка. На галоўным месцы стаяў поўны збор Брокгаўза і Эфрона... Казалі, па тым часе Бібліятэка сусветнай літаратуры каштавала як "Волга". У калекцыі дзядзькі Мішы згаданая Бібліятэка заняла толькі адну сценку...

Дзядзька Міша завёў сабе і чытачоў, чалавек дзесяць абраных. Платы не браў. Мы плацілі яму размовамі, спрэчкамі і крытычным аналізам прачытанага. Кніжкі можна было браць дахаты, пазначыўшы кожную ў спецыяльным сшытку. Толькі тут былі "Момант ісціны" Багамолава і вострадэфіцытны "Джын Грын — недатыкальны", адным з аўтараў якога быў Аксёнаў.

Кайтсёрферы з Елкаўскай сельскай бібліятэкі

Ільняная спадчына Ганчарскага дома культуры

Дзень паэзіі на Століншчыне

ГАЛОЎНАЕ — ЧАЛАВЕК

Я прыехаў з універсітэцкай сесіі і даведаўся пра тое, што дзядзька Міша памёр. Бібліятэка дасталася ягонаму пляменніку, які, падаецца, і чытаць умеў не вельмі. Але не будзем пра кепскае.

Вы заўважылі, што пісаў я не столькі пра бібліятэку, колькі пра яе ўладальніка. Не важна, якая ўстанова, дзяржаўная ці прыватная, галоўнае, каб стаяла за ёй Асоба. Тады і атрымліваецца з'ява. Балазе ў сферы нашай культуры асоб — шмат, з'яў — таксама. Пра іх і далейшая гаворка.

"ЛЁГКІЯ ШЛЯХІ НЕ ДЛЯ НАС"

"Кірмаш талентаў" — так назвалі справаздачны канцэрт у аграгарадку **Мазалава Віцебскага** раёна. Андрэй Струнчанка піша: *"У канцэрце бралі ўдзел калектывы мастацкай творчасці мясцовых устаноў культуры: дзіцячай школы мастацтваў і СДК. Канцэрт быў тэатралізаваным. А асновай для сцэнарыя паслужыла ідэя кінастужкі "Вяселле ў Малінаўцы". Сцэнарый падрыхтавалі ўдзельнікі тэатральнага калектыву "Вобраз". А дапамагалі рэалізоўваць ідэю танцавальны гурт "Калінка" дзіцячай школы мастацтваў, народны ансамбль народнай песні і музыкі "Вераснянка" і народны жаночы клуб "Залаты ўзрост". А кіраўнік гуртка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Ала Антаненка ўдала выканала ролі мастака-афарміцеля, касцюмера і грымёра. Не дзіва, што гледачы адрэагавалі бурнымі апладысментамі".* Не магу не пракаментаваць. Навіна з Мазалава — тая шчаслівая сітуацыя, калі ідэю нарадзіў калектыў Асоб. Справаздачных канцэртаў я бачыў шмат, а вось тэатралізаваных ды яшчэ з прыцягненнем такіх кампетэнтных спецыялістаў чуць і бачыць не даводзілася. Лічу, што мазалаўскім аматарам прыгожага пашанцавала. Як казаў знаёмы бухгалтар, чым большая калькуляцыя, тым больш важкая каса. Ён, натуральна, меў рацыю.

ЛЁН НЕ ЛЮБІЦЬ ГУЛЁН

Мне пра гэта яшчэ вясковая цётка Вара казала. Была яна пасля вайны старшынёй калгаса, дысцыпліну ў калектыве трымала жалезную. Вось яна і патлумачыла мне неяк, што лён вырасціць — як жыццё пражыць. Той жа думкі прытрымліваюцца і ў **Ганчарскім** доме культуры **Лідскага** раёна. Днямі тут адкрылася творчая майстэрня "Калі да лёну з паклонам — добра аддзячыць лён". Яе дзейнасць будзе ажыццяўляцца ў рамках экскурсійнага тура "Вёска — крыніца культуры". Напісала пра гэта Алена Габіс, метадыст аддзела метадычнай і культурна-масавай работы Лідскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці. *"Працэс вырошчвання і апрацоўкі лёну, —* распавядае аўтарка, *— складаецца з некалькіх этапаў. Пра кожны з іх цудоўна ведае і можа распавесці ахвотным загадчыца Ганчарскага дома культуры Ганна Булай".* Чарговая асоба — чарговы важкі праект. Ацаніце назву экскурсійнага туру — "Вёска — крыніца культуры". Толькі так і не інакш!

ДЗЕ НАРАДЖАЕЦЦА НАТХНЕННЕ?

Паэзія — асаблівы від літаратуры. Гэта, можна сказаць, адметны рух душы. Добрай паэзіяй можна загойваць раны і сцішваць зло. Прыкладна пра гэта напісала ў рэдакцыю "К" загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Столінскай** раённай бібліятэкі Надзея Стахавец. Днямі ў бібліятэках Століншчыны прайшоў Дзень паэзіі. Спадарыня Надзея распавядае: *"Чыталі і слухалі вершы ў Столінскай дзіцячай, Давыд-Гарадоцкай гарадской і дзіцячай, Рэчыцкай гарпасялковай, Рубельскай, Стружскай, Дубайскай і некаторых іншых бібліятэках. У Столінскай дзіцячай юныя чытачы сустрэліся з мясцовай паэткай Ларысай Вырко. А гарадская бібліятэка назвала вечар паэтычнага настрою "Тут нараджаецца натхненне".*

ПАКАТАЕМСЯ ПА КНІЖНЫХ ХВАЛЯХ!

Кайтсёрфінг — від спорту, калі і на вялікім паветраным змеі лётаеш, а яшчэ адначасова — па хвалях на дошцы катаешся. У **Елкаўскай** сельскай бібліятэцы **Зэльвенскага** раёна паспрабавалі кайтсёрфінг прыстасаваць пад катанне па кніжных хвалях. Імправізаваны новы від літаратурнага спорту дазволіў юным чытачам пазнаёміцца з кніжнымі навінкамі ўсіх магчымых літаратурных жанраў. Напісала пра гэта Вольга Камякевіч, намеснік дырэктара Зэльвенскай раённай бібліятэкі. Асоба, якая сама пастаянна шукае новыя формы працы і падначаленых усяляк да гэтага заклікае. У выніку нараджаюцца справы, якія надоўга застаюцца ў дзіцячай памяці.

ВІТАЮ ЦЯБЕ, КЛОЎН

Нам так не хапае сёння гумару, што я ніяк не мог абысці навіну з аграгарадка **Гальшаны Ашмянскага** раёна. У Дзень гумару да дзяцей прыйшлі ў мясцовы аддзел культуры і вольнага часу клоўн Клёпа і яго памочніца Сімка. Усе разам яны вандравалі па Краіне Смеху. І я ім шчыра зайздрошчу.

Пішыце пра цікавае і беражыце сябе!

Сустрэнемся праз тыдзень.

Яўген РАГІН

Галоўнае — паўзу запоўніць

Вольга Бабруйка

Вольга Бабруйка нарадзілася ў гарадскім пасёлку Парычы Светлагорскага раёна. Скончыла музычную школу па класе харэаграфіі, займалася ў тэатральным і вакальным гуртках. Хоць з дзяцінства сама пісала сцэнарыі для ўдзелу ў пазакласных школьных ды клубных мерапрыемствах, але над выбарам будучай прафесіі думала доўга.

Паехала на падрыхтоўчыя курсы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і стала марыць вучыцца менавіта тут. У 2012 годзе мары здзейсніліся, а спецыяльнасць "культуралогія і сацыякультурная дзейнасць" стала роднай.

ДЗЕ ЛЕПШ БЫЦЬ ПЕРШАЙ?

Тэорыі ў універсітэце давалі шмат. Вольга адразу пачала сумяшчаць яе з практыкай. Вучылася і працавала. Спачатку ў дзіцячым садку педагогам дадатковай адукацыі па класе "харэаграфія", затым у караокеклубе вядучай, а яшчэ — аніматарам у забаўляльным цэнтры.

Яна вучылася на бюджэтнай аснове па мэтавым накіраванні, так што заставацца ў Мінску не планавала. Добра запомніла фразу куратара, вельмі мудрай жанчыны: "Лепш быць першай у маленькім горадзе, чым нябачнай у вялікім". У 2016 годзе выпускніца адправілася на месца свайго размеркавання ў Светлагорскі дом культуры энергетыкаў, на пасаду загадчыка аддзела вольнага часу і прадстаўленняў. Яна піша сцэнарыі, падбірае музычнае афармленне і ладзіць праграмы.

У першыя дні працы маладому спецыялісту па плане трэба было праводзіць дзіцячую анімацыйную праграму, а яшчэ праз пару дзён — канцэрт да Дня будаўніка. Натуральна, хвалявалася. Падтрымалі мастацкі кіраўнік і сам калектыў.

Калі выйшла першы раз на сцэну, каленкі трэсліся ад хвалявання, але ўсё атрымалася. Так з кожным днём усё глыбей пранікала Вольга ў сутнасць сваёй працы. Пакрысе і алгарытм поспеху з'явіўся: не бойся, бяры і рабі, усміхайся на сцэне і — усё атрымаецца! І сапраўды пачало атрымлівацца.

НЕ ДОГМА...

За плячыма ў Вольгі — ужо пяць гадоў працоўнага стажу, але ўсё роўна хваляванне на канцэртах прысутнічае, хоць гледачы гэтага не заўважаюць. Раўнавагу дапамагаюць вярнуць сцэнічнае адзенне, макіяж, стыль падачы матэрыялу. І яшчэ — уменне імправізаваць. Сцэнарый не догма, а гледачы не павінны разумець, што нешта пайшло не па плане, бо яны ж не ведаюць, якім той план быў. Галоўнае своечасова запоўніць паўзу.

Быў выпадак, калі аб'явіла Вольга групу, а яе няма, артысты не выходзяць. Прыйшлося імправізаваць на поўную, як той казаў, катушку. Калі перад табой больш за 3000 чалавек у зале, неяк няёмка пакідаць іх без атмасферы свята.

СКАЗАЦЬ "ГОРКА!" МОЖА КОЖНЫ

Вольга вельмі хацела весці вясельныя ўрачыстасці. Паспрабавала — і ў яе выдатна ўсё атрымалася. Напэўна, і гэта дадатковая практыка. Сказаць "Горка!" можа кожны, а зрабіць свята — адзінкі. Вольга Аляксандраўна патрапіла менавіта ў гэтыя адзінкі. Улічвае склад гасцей, іх узрост, сацыяльны статус. І ніякай пошласці!

Яшчэ адзін напрамак работы — вядзенне школьных выпускных вечароў. Для гэтых мерапрыемстваў Вольга Аляксандраўна заўсёды рыхтуе сцэнарыі, у якіх імкнецца прадугледзець удзел у конкурсах не толькі выпускнікоў, але і настаўнікаў, бацькоў. Летась вяла выпускны вечар у гімназіі, атрымала шмат удзячных водгукаў, ужо запрошаная правесці выпускны вечар у гімназіі сёлета.

Для таго каб быць у тонусе, яна наведвае майстар-класы адтопавых спікераў з розных гарадоў. Майстар-класы каштуюць дорага, але самая добрая інвестыцыя — гэта інвестыцыя ў свае веды.

СПЯВАЧКА І АКТРЫСА

Вольгі Бабруйка не толькі вядучая. Яна — салістка вакальнага гурта "DZIVA". Песні для рэпертуару гурт выбірае сучасныя і папулярныя, якія ведае і моладзь, і старэйшае пакаленне. Акрамя таго, сумесна з сяброўкамі па ансамблі Вольга піша сцэнарыі навагодніх мюзіклаў і выконвае ў іх розныя ролі. У ліпені 2021 года з поспехам летам прайшоў мюзікл "Купальская ноч".

Творчасць — гэта пастаянная праца над сабой. Вольга Бабруйка гэта цудоўна разумее. І не шкадуе аб выбранай прафесіі. Часам займаецца хатнімі справамі, а ў думках — усё роўна на працы. Для таго каб быць у тонусе, наведвае майстар-класы ад топавых спікераў з Санкт-Пецярбурга, Разані... Майстар-класы каштуюць дорага, але, як кажа Вольга Аляксандраўна, самая добрая інвестыцыя — гэта інвестыцыя ў сябе, у свае веды. Быць не падобнай на калег — яе крэда, яе візітоўка і рэклама.

Галіна КАПЕЦКАЯ,
Светлагорск

Усё жыццё — пад музыку

"Душа — пад музыку — вандруе. Вандруе — змяняецца. Усё маё жыццё — пад музыку", — такое адчуванне, што словы Марыны Цвятаевай былі адрасаваныя музыканту, кампазітару, хормайстру Аляксандру Ляху, Ганароваму грамадзяніну Смаргонскага раёна.

У інтэрв'ю Аляксандр Палікарпавіч успамінае далёкі 1964 год, калі ён, навучэнец Маладзечанскага музвучылішча, сямнаццацігадовы хлопец, па прапанове Альгерда Апановіча прыехаў у Смаргонь у якасці хормайстра. Тады толькі зараджаўся ансамбль песні і танца імя Міхала Клеафаса Агінскага, які неўзабаве атрымаў неймаверную папулярнасць і званне "народны".

БАТАРЭЙКІ ХАПАЕ НАДОЎГА

Невялікі перапынак у працы — войска трэба было прайсці — і Аляксандр Лях зноў у Смаргоні. Ужо надоўга. З нашага горада ён паехаў у Мінск дваццаць дзевяць гадоў таму, але па-ранейшаму пастаянна прыязджае на рэпетыцыі хору. І не аднаго. Ён таксама нязменны кіраўнік Смаргонскага хору ветэранаў, які быў створаны ў 1976 годзе на базе ААТ "Смаргонскі завод аптычнага станкабудавання". А ў Мінску — вакальнага ансамбля «Акавіта» Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.

Адкуль столькі энергіі ў гэтым чалавеку? У адказ Аляксандр Палікарпавіч усміхаецца і сцвярджае, што ад гледача яго творчая батарэйка зараджаецца такой энергіяй, якой хапае надоўга.

У скарбонцы кампазітара — два зборнікі песень. На сцэне гучаць творы, напісаныя на вершы многіх беларускіх паэтаў. У тым ліку і нашых землякоў — Мар'яна Дуксы (з паэтам Аляксандра Ляха звязвалі сувязі дружбы), Валянціны Бажыдай (удзельніца хору і вялікі натхняльнік кампазітара, на яе вершы ён напісаў 15 песень).

НАРАДЖЭННЕ Ў ПАКУТАХ

На музыку Аляксандра Ляха гучаць гімны горада Смаргоні, а таксама СШ №1 горада Смаргоні і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Кампазіцыя "Курсантам Інстытута нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь прысвячаецца" — таксама своеасаблівы гімн.

"Як нараджаюцца творы? — паўтарае пытанне мой суразмоўца. — Песні нараджаюцца ў пакутах. Дзясяткі разоў перарабляю напісанае. Пішу сэрцам і душой. І толькі калі твор гатовы, яго выконваюць на сцэне, у душы — урачыстасць ад таго, што ён гучыць, і радасць за людзей, якія яго выконваюць".

Многія кампазіцыі музыкі прысвечаны каханай жанчыне — жонцы Таццяне, яна таксама па адукацыі музыкант, "апора, верны сябар, першы слухач, крытык, цэнзура і дзяржкантроль".

Таццяна Якаўлеўна называе мужа і яго братоў "хлопчыкамі, пацалаванымі Богам", бо Леў, Міхаіл, Аляксандр і Анатоль Ляхі па адукацыі ўсе — музыкі. Любоў да мастацтва ў іх ад мамы (тата — настаўнік фізікі і матэматыкі), якая выдатна спявала, скончыла курсы пры Краснадарскай кансерваторыі. Праўда, вакальны дар — толькі ў Аляксандра Палікарпавіча, астатнія браты — інструменталісты.

"Смаргонь стала для мужа асаблівым горадам. Месцам яго любімай працы. Горадам-лёсам. Горадам жыцця", — заўважыла Таццяна. Як жа дакладна ды тонка прыкмечана...

ТЭМ ДЛЯ РАЗМОЎ ШМАТ

"Кажуць, песня — гэта заўсёды нейкі аповед. Каб яна закранула сэрцы слухачоў, аўтар павінен яе "пражыць", прапусціць праз сябе. Кажуць, прыгажосць выратуе свет, а я ўпэўнены, што не адна прыгажосць выратуе свет, а толькі разам з дабрынёй", — па-філасофску заўважыў напрыканцы гутаркі маэстра. І прызнаўся, што марыць стварыць кампазіцыі духоўна-рэлігійнай накіраванасці. Хоча пагаварыць са слухачом і на гэту тэму.

Галіна АНТОНАВА,
Смаргонь
Фота аўтара

Аляксандр Лях

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 15 / 9 КРАСАВІКА 2022 г.

Называўся атрад — “Слаўны”

Рэканструкцыя партызанскага мемарыялу

У гады Вялікай Айчыннай вайны на акупаванай тэрыторыі Беларусі дзейнічала 89 спецгруп і атрадаў органаў дзяржбяспекі, з іх 11 — на Магілёўшчыне. Гаворка пойдзе пра спецатрад "Слаўны" пад камандаваннем капітана дзяржбяспекі Анатоля Шастакова.

САМЫЯ-САМЫЯ

“Слаўны” сфарміравалі з 49 байцоў у лютым 1942 года ў расійскім горадзе Казельск. У склад увайшлі вопытныя супрацоўнікі дзяржбяспекі, выпускнікі спецшкол НКУС, прафесійныя мінёры-падрыўнікі, 18 спартсменаў: рэкардсмен свету па гірах мінчанін Мікалай Шатаў, майстар спорту па плаванні Анры Конрад Мадэй, майстры спорту, лёгкаатлеты браты Знаменскія, сямікратны чэмпіён СССР па акадэмічным веславанні Аляксандр Далгушын і іншыя.

Асноўная задача атрада — дыверсійная і разведвальная дзейнасць у тыле праціўніка.

20 лютага 1942 года “Слаўны” перасек лінію фронту. 15 месяцаў дзейнічаў на Браншчыне, столькі ж — на тэрыторыі Гомельскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях.

ВАЙСКОВЫ РАХУНАК

Падчас баявых дзеянняў спецатрад прайшоў больш за паўтары тысячы кіламетраў. Знішчаны 23 фашысцкія гарнізоны, 22 эшалоны, больш за тры тысячы германскіх ваеннаслужачых, здзейснена 85 дыверсій на камунікацыях і іншых аб’ектах ворага, сабраны і перададзены на вялікую зямлю вялізны аб’ём разведінфармацыі.

Начальнік штаба атрада Міхаіл Абаротаў у сваім дзённіку так ахарактарызаваў сваіх таварышаў: *“Наш атрад служыць прыкладам для ўсіх партызанскіх атрадаў. Байцы нашы — дысцыплінаваныя, смелыя, знаходлівыя. Калі ў аперацыі з намі ўдзельнічае іншая група, то гэтыя партызаны адчуваюць сябе смялей, бо ведаюць, што з шастакоўцамі нідзе не прападзеш”.*

ПАД ВЕКАВЫМ ДУБАМ

Далей Абаротаў піша пра тое, як яны атрымалі радыёграму берагчы чэмпіёнаў, а па магчымасці пераправіць іх праз лінію фронту. Мадэй адмовіўся. Начальнік штаба назваў яго партызанскім героем.

Асноўным месцам дыслакацыі спецатрада на Магілёўшчыне стаў востраў Верамеёўка ва Усакінскіх балотах, размешчаны на стыку Клічаўскага і Бялыніцкага раёнаў. Тут, пад векавым дубам, байцы хавалі сваіх баявых таварышаў.

ВЕРНУТЫ З НЯБЫТУ

Нягледзячы на тое, што ў другой палове XX стагоддзя востраў знаходзіўся ў зоне ваеннага авіяпалігона, дзе ладзіліся вучэбныя бомбамятанні, час захаваў абрысы могілак. Вясной 1997 года ў выніку карпатлівай пошукавай работы былі вернуты з нябыту імёны пахаваных на востраве байцоў “Слаўнага”.

Памятны мемарыял у гонар загінулых партызанскіх байцоў атрада “Слаўны” створаны з ініцыятывы адміністрацыі раёна, краязнаўцаў, мінскага вытворча-камерцыйнага прадпрыемства “Рытм”. Урачыстае адкрыццё адбылося 5 мая 1997 года. На карце Клічаўскага раёна з’явіўся яшчэ адзін помнік героям мінулай вайны.

З выступлення разведчыцы атрада масквічкі Настассі Елісеевай на адкрыцці мемарыялу: *“Калі мы хавалі тут нашых таварышаў, мы паабяцалі вярнуцца пасля вайны да гэтага дуба, знайсці месца, дзе засталіся нашы хлопцы”.* Вярнуліся і знайшлі.

АДНАЎЛЕННЕ

Мемарыял на востраве сярод балот не забыты. Яго рэгулярна наведваюць, даглядаюць за могілкамі. Дабрацца сюды па балоце няпроста, але гэта не перашкода.

У 2018 годзе воінскім могілкам партызанскага атрада “Слаўны” прысвоены статус гісторыка-мемарыяльнага месца захавання.

Летась праведзена маштабная рэканструкцыя мемарыяла. Будаўнічыя матэрыялы дастаўляліся на востраў верталётам МНС. Заменена агароджа пахавання, устаноўлены мармуровыя надмагіллі, прадугледжана зона адпачынку для наведвальнікаў.

Наталля ХРАМЯНКОВА, дырэктар Клічаўскага краязнаўчага музея

“Слаўны”.

Будматэрыялы для рэканструкцыі дастаўляюцца верталётам

Дастаўка помніка на востраў

Адкрыццё мемарыялу. 1997 год

Так выглядае мемарыял сёння

Згадка

Слонімскі маэстра Марат Малікаў

Летась у сакавіку споўнілася 80 гадоў з дня нараджэння слонімскага педагога, музыканта, дырыжора і кампазітара Марата Аляксеевіча Малікава (1941—2000). Вельмі шкада, але лёс яму адмераў толькі 59 гадоў жыцця. Большую частку з іх ён пражыў у Слоніме, які стаў яму родным і блізкім, а слонімцы — самымі светлымі і шчырымі землякамі.

Родам Марат Аляксеевіч быў з Чэрвеня Мінскай вобласці. Ён нарадзіўся вясной 1941 года, перад самым пачаткам вайны. Вайну ён не памятаў, а вось цяжкі і няпросты пасляваенны час Марат перажыў у родным Чэрвені. Калі вучыўся ў школе, пачаў спяваць у хоры, іграў у аркестры народных інструментаў. Пазней вырашыў стаць прафесійным музыкантам. Ён паступіў у Гродзенскае музычнае вучылішча, а пасля вучылішча застаўся там працаваць і навучаць дзяцей музычнаму майстэрству.

У 1966 годзе Марат Малікаў развітаўся з Гродна і прыехаў у Слонім. Багацце ўнутранага свету, працаздольнасць выяўляліся ў яго праз педагагічную дзейнасць. У Слонімскай музычнай школе Марат Аляксеевіч не толькі быў загадчыкам народнага аддзялення, але яшчэ адказваў за культмасавую працу і нават спартыўную.

Педагог быў у пастаянным пошуку. На яго плячах ляжала адказнасць за поспехі народнага аркестра народных інструментаў Слонімскага раённага Дома культуры, узорнага аркестра народных інструментаў Слонімскай дзіцячай школы мастацтваў, хору Паўлаўскага сельскага Дома культуры, калектываў мастацкай самадзейнасці Слонімскага быткамбіната і медаб’яднання. Без слонімскага маэстра не адбываліся многія спектаклі і выступленні Слонімскага народнага тэатра, народнага хору ветэранаў вайны і працы “Памяці” Слонімскага РДК. І ўсюды паспяваў гэты спакойны, шчыры і сумленны чалавек.

Марат Малікаў вельмі любіў музыку. Ён быў вялікім энтузіястам, цаніў мастацтва, захапляўся творчасцю Чайкоўскага, Бетховена, Шастаковіча, Смольскага. Любіў слухаць выступленні розных калектываў па тэлебачанні і радыё. Сам інструментаваў шмат твораў для аркестра.

Шчыра сябраваў Марат Аляксеевіч са слонімскім кампазітарам Міхаілам Гарабцом. Ён сабраў усе творы Міхаіла Гарабца і хацеў іх выдаць асобнай кнігай. Не паспеў.

“Сапраўдная музыка — гэта багацце душы, адданае людзям праз цудоўнае, бо чалавек цудоўным робіцца тады, калі яго душой валодаюць узвышаныя памкненні”, — казаў Марат Аляксеевіч.

Заслугі нашага земляка адзначаны рознымі дыпломамі і граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі, Міністэрствам культуры Беларусі, абласным і раённымі выканкамамі, медалямі. Але не гэта самае галоўнае, а тое, што ў Слоніме зусім нядаўна жыў цудоўны, здольны чалавек, які застаўся ў нашай памяці як ініцыятыўны і творчы, сціплы і шчыры. Пра такіх людзей мы не павінны забываць ніколі.

Сяргей ЧЫГРЫН

У Беларусі налічваецца каля сямі тысяч бібліятэк. Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэцы (РНТБ) адведзена асаблівая роля. Гэта адзіная ўстанова ў краіне, дзе максімальна поўна прадстаўлены інфармацыйныя рэсурсы па тэхніцы, тэхналогіях, прыкладной навуцы, інтэлектуальнай уласнасці і эканоміцы вытворчасці, якія даюць магчымасць эфектыўна арганізаваць вытворчыя працэсы, навуковую, навукова-тэхнічную і інавацыйную дзейнасць з улікам існуючых сусветных тэндэнцый.

Бібліятэка фарміруе мысленне

Інфармацыйнае забеспячэнне рэальнага сектара эканомікі

Будынак, у якім знаходзіцца бібліятэка

Сёлета РНТБ адзначае 45-годдзе. Для звычайнага прадпрыемства гэта зусім нязначны ўзрост. Але калі ўстанова з'яўляецца інфармацыйнай, 45 гадоў — эпоха. Створаная 1 сакавіка 1977 года на базе навукова-тэхнічнай бібліятэкі Беларускага навукова даследчага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі і тэхніка-эканамічных даследаванняў (БелНДІНТІ), РНТБ з'яўляецца сёння галоўнай бібліятэкай краіны па інфармацыйным забеспячэнні прыкладной навукі і рэальнага сектара эканомікі.

ПЕРШАЯ

Бібліятэка мае пяць філіялаў ва ўсіх абласных цэнтрах краіны.

Калі паспрабаваць апісаць гісторыю функцыянавання РНТБ адным словам, то найбольш дакладным стане дэфініцыя "першая". Лічыце самі.

1980 год — пачалася аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў. Практычная работа здзяйснялася сумесна з БелНДІНТІ на электронна-вылічальнай машыне ЕС-1022. 1989 год — укаранілі новы механізм гаспадарання і распачалі інфармацыйна-бібліятэчнае абслугоўванне прадпрыемстваў і ўстаноў краіны па дагаворах. 1999 год — абсталяваны першы інтэрнэт-цэнтр, у якім карыстальнікі разам з бясплатным доступам у Сусветнае павуцінне атрымалі магчымасць прайсці навучанне асновам работы ў Інтэрнэце, атрымаць азы камп'ютарнай пісьменнасці. 2003 год — у першай сярод бібліятэк краіны ўведзена служба электроннай дастаўкі дакументаў. Гэтая паслуга стала настолькі запатрабаванай, што і цяпер праз яе каля двухсот прадпрыемстваў штогод і аператыўна атрымліваюць патрэбныя ім дакументы.

2004 год — у рамках міжнароднай акцыі "Нядзеля ўстойлівага развіцця" ў РНТБ створана першая ў краіне бібліятэка па ўстойлівым развіцці. 2011 год — РНТБ першай укараніла аўтаматызаваную сістэму выбарачнага распаўсюджвання інфармацыі. Карыстальнікі займелі магчымасць бясплатна атрымліваць на электронную паштовую скрыню інфармацыю аб новых паступленнях у фонды. Больш за 150 беларускіх прадпрыемстваў ацанілі карысць сістэмы і з'яўляюцца яе пастаяннымі карыстальнікамі. Дарэчы, вопыт РНТБ стаў настолькі паспяховым, што быў пераняты іншымі вядучымі бібліятэкамі краіны. 2016 год — у рамках праекта стварэння і развіцця сеткі цэнтраў падтрымкі тэхналогій і інавацый (ЦПТІ), які рэалізуецца ў адпаведнасці з Пагадненнем паміж Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці і Сусветнай арганізацыяй інтэлектуальнай уласнасці ад 10 кастрычніка 2016 года, у РНТБ створаны першы ў краіне ЦПТІ другога ўзроўню. У 2020 годзе аналагічныя цэнтры адчынілі свае дзверы ў абласных філіялах РНТБ. У працы цэнтраў нароўні з высокакваліфікаванымі спецыялістамі РНТБ удзельнічаюць патэнтныя паверанныя. Тут карыстальнікі маюць магчымасць не толькі замовіць патэнтна-інфармацыйны пошук, але і атрымаць кансультацыі па пытаннях абароны інтэлектуальнай уласнасці, рэгістрацыі прамысловых узораў, таварных знакаў, па патэнтных пошлінах і г.д.

2021 год — пачаў функцыянаваць Орхускі цэнтр г. Гродна — першы рэгіянальны ў Рэспубліцы Беларусь, створаны з мэтай садзейнічання рэалізацыі палажэнняў Орхускай канвенцыі аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў па пытаннях, якія датычацца навакольнага асяроддзя.

Паслугамі і рэсурсамі РНТБ карыстаюцца спецыялісты амаль усіх сфер дзейнасці. З'яўляючыся рэспубліканскім дэпазітарыем айчыннай і замежнай літаратуры па тэхніцы, тэхналогіях, эканоміцы прамысловасці і сумежных галінах, дзяржаўным сховішчам патэнтнай дакументацыі, тэхнічных нарматыўных прававых актаў і прамысловых каталогаў, РНТБ і яе філіялы паспяхова адказваюць на самыя розныя інфармацыйныя запыты навукова-тэхнічнай і вытворчай сферы. Сярод карыстальнікаў РНТБ такія гіганты айчыннай прамысловасці, як БелАЗ, МАЗ, Белшына і інш., і невялічкія прыватныя прадпрыемствы.

Будучы чытач

Штогод бібліятэка забяспечвае неабходнай інфармацыяй каля 2 200 прадпрыемстваў і арганізацый з больш чым 250 населеных пунктаў.

СУПРАЦА І ПРАЕКТЫ

У рамках заключаных пагадненняў бібліятэка цягам многіх гадоў супрацоўнічае з арганізатарам найбуйнейшых у Рэспубліцы Беларусь выставачных мерапрыемстваў — заснавальнікам Міжнароднага Саюза Выставак і Кірмашоў СНД — УП "Экспафорум" і Міжнароднай выставачнай кампаніяй ЗАТ "Мінскэкспа". Інфармацыйныя стэнды РНТБ штогод можна ўбачыць на самых прадстаўнічых міжнародных прамысловых выставах.

РНТБ выконвае яшчэ адну важную грамадскую місію — фарміраванне вынаходніцкага мыслення ў дзяцей і падлеткаў.

Гродзенскі філіял з 2020 года ўдзельнічае ў акцыі "Старт для новых ідэй!", якая праводзіцца для далучэння падлеткаў да працэсу тэхнічнай творчасці і павышэння інфармацыйнай пісьменнасці ў сферы вынаходніцтва на этапах «дзіцячы садок — школа — вышэйшая навучальная ўстанова».

Магілёўскі і Віцебскі філіялы з'яўляюцца прадстаўнікамі Міжнароднага дзіцячага конкурсу «Школьны патэнт — крок у будучыню».

На базе Віцебскага філіяла створаны інфармацыйны цэнтр "Витебск — ТРИЗ — ИНФО". Тэорыі рашэння вынаходніцкіх задач (ТРВЗ) сёння надаецца асаблівае значэнне, бо ў сучасных умовах ТРВЗ выкарыстоўваецца не толькі ў інжынернай творчасці, але і пранікае ў іншыя галіны чалавечай дзейнасці — рэкламу, адукацыю, педагогіку, мастацтва і інш. У інфармацыйным цэнтры сабрана літаратура па пытаннях інтэлектуальнай уласнасці, вынаходніцтве, сумежных дысцыплінах, амаль штомесячна адбываюцца цікавыя лекцыі і сустрэчы.

ЗАМЕСТ ЗАКАНЧЭННЯ

Згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, РНТБ з'яўляецца метадычным цэнтрам для навукова-тэхнічных бібліятэк краіны. Яна паспяхова выконвае і гэтую місію: штогод арганізуе адукацыйныя семінары для бібліятэк сваёй сеткі, выдае метадычныя матэрыялы, кансультуе. У 2022 годзе з мэтай павышэння кваліфікацыі і ўдасканалення прафесійных навыкаў спецыялістаў РНТБ абвясціла конкурс на лепшую навукова-тэхнічную бібліятэку. Яго вынікам стануць наватарскія ідэі, выдатныя праекты і — самае галоўнае — новыя творчыя ініцыятывы.

Марына ПШЫБЫТКА,
вучоны сакратар
Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі

Лічбы і факты

Фонд бібліятэкі – звыш 58 млн экз.

Больш за 395 тыс. карыстальнікаў

Летась ім было выдадзена больш за 1,6 млн экз. дакументаў

На партале ўстановы з'явілася звыш 860 артыкулаў і больш за 180 выстаў

За 2021 год адбылося больш за 140 экскурсій

Штогод ладзіцца звыш 650 мерапрыемстваў, арганізаваных разам з філіяламі

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 15 / 9 КРАСАВІКА 2022 г.

Законы, напісаныя па-свойму

Якімі былі першыя правобразы Асноўнага Закона ў Беларусі, які ўплыў яны аказалі на развіццё сусветнай прававой думкі і якое дачыненне да старабеларускага заканадаўства можа мець наш першадрукар Францыск Скарына?

Францыск Скарына не надрукаваў першы Статут, але, магчыма, удзельнічаў у яго распрацоўцы.

Тэкст першага Статута ВКЛ 1529 года.



Першая старонка трэцяга Статута, зацверджанага ў 1588 годзе.



Сучаснае выданне Статута ВКЛ 1588 года.

Леў Сапега быў аўтарам прадмовы да трэцяга Статута ВКЛ і аплаціў яго першае выданне.

У сакавіку ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася заключная сустрэча з цыкла лекцый "Крыніцы гістарычнай памяці", прысвечаная ролі Статутаў Вялікага Княства Літоўскага ў кантэксце гісторыі права Беларусі. У якасці эксперта-дакладчыка выступіў кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзімір Падалінскі.

Агулам за тры месяцы адбылося восем сустрэч, прысвечаных разнастайным відам гістарычных крыніц аб мінуўшчыне Беларусі, такім як летапісы, старадаўняя мастацкая літаратура, карты, помнікі эпіграфікі, тапаніміка, дакументы партызан часоў Вялікай Айчыннай вайны. Сустрэчы, ладжаныя ўжывую ў сценах бібліятэкі, таксама трансляваліся анлайн, а іх відэазапісы застаюцца даступнымі на відэаканале ўстановы, таму агульная аўдыторыя лекцый дасягае некалькіх тысяч гледачоў.

У кантэксце Года гістарычнай памяці і звароту да каранёў ды вытокаў беларускай гісторыі і культуры, а таксама ў сувязі з уступленнем у дзеянне змен і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, прынятых па выніках рэспубліканскага рэферэндуму, гэтым разам увага была звернутая на такі важны від гістарычных дакументаў, як крыніцы па гісторыі права Беларусі. Вядома, што першымі агульнадзяржаўнымі дакументамі, якія рэгулявалі жыццё нашых продкаў і з'яўляліся своеасаблівымі правобразамі Асноўнага Закона, былі менавіта Статуты Вялікага Княства Літоўскага.

НА ШЛЯХУ ДА АДНАСТАЙНАСЦІ

Да з'яўлення Статутаў прававая сістэма ВКЛ у XII — XV стагоддзях развівалася збольшага на аснове звычаёвага права, якое перадавалася праз вусную традыцыю, і ў меншай ступені на падставе пісьмовых крыніц права, якія можна падзяліць на царкоўныя і свецкія — да апошніх, што тычыліся агульнаграмадскага жыцця, адносіліся нормы Рускай Праўды (найстаражытнейшага зводу законаў Кіеўскай Русі, які ўзнік яшчэ ў XI стагоддзі ў часы кіравання Яраслава Мудрага), гандлёвыя дагаворы, прывілеі, якія надаваліся вялікімі князямі літоўскімі, а таксама пастановы соймаў і судоў.

Першым жа агульнадзяржаўным прававым актам, што тычыўся ўсёй тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, быў прывілей вялікага князя Казіміра Ягайлавіча, выдадзены ў 1447 годзе, які быў важным крокам да цэнтралізацыі земляў дзяржавы і ўзнікнення агульнадзяржаўнага права. Натуральна, складзены гэты дакумент быў на старабеларускай мове, што фактычна надавала ёй статус афіцыйнай мовы ВКЛ, нягледзячы на тое, што княства было шматканфесійнай і шматнацыянальнай дзяржавай.

Вялікае Княства Літоўскае ў XV стагоддзі было велізарнай дзяржавай, якая ахоплівала тэрыторыі сучасных Беларусі, Літвы і Украіны, таму мясцовыя прававыя традыцыі на ўсім гэтым абшары, якія часам маглі істотна адрозніваццa, патрабавалі прывядзення да аднастайнасці, уніфікацыі і кадыфікацыі. Першай спробай стварэння такога адзінага агульнадзяржаўнага дакумента быў "Судзебнік", які з'явіўся ў 1468 годзе і аб'ядноўваў толькі нормы крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права.

Прывілей меў даволі прагрэсіўны для свайго часу характар — ён агаворваў правы сярэдніх слаёў грамадства, правы жанчын пры ўступленні ў шлюб, уводзіў прынцып персанальнай адказнасці за здзейсненыя злачынствы. Акрамя таго, замацоўвалася, што займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ могуць толькі мясцовыя ўраджэнцы.

У БАРАЦЬБЕ ЗА САМАСТОЙНАСЦЬ

Неабходнасць стварэння агульнадзяржаўнага прававога кодэкса ў выглядзе Статута ўпершыню была агучаная ўжо ў часы панавання вялікага князя Жыгімонта Старога, а ў дзеянне ён уступіў у 1529 годзе. Вядома, што першы Статут ВКЛ, на жаль, так і не быў надрукаваны — але, тым не менш, ёсць усе падставы меркаваць, што ў яго распрацоўцы мог удзельнічаць наш першадрукар Францыск Скарына, які ў той час ужо вярнуўся з Прагі на радзіму і валодаў багатымі ведамі па гісторыі права, што знайшло адлюстраванне і ў яго славутых прадмовах да кніг Бібліі.

Пазней, у сувязі з неабходнасцю ўдасканалення прававой сістэмы, былі выдадзеныя яшчэ два Статуты, у 1566 і 1588 гадах — апошні з іх даследчыкі лічаць найбольш дасканалым на той час зводам законаў у свеце. Так, ён прадугледжваў адказнасць шляхты за забойства простага чалавека, абмяжоўваў пакаранне няпоўнагадовых, замацоўваў прынцыпы верацярпімасці і рэлігійнай талерантнасці.

Распаўсюджанае меркаванне, што тэкст Статута быў створаны вядомым палітычным дзеячам ВКЛ, вялікім канцлерам Львом Сапегам, не адпавядае рэчаіснасці. Тым не менш да гісторыі гэтага кодэкса Сапега мае непасрэднае дачыненне: па-першае, ён напісаў да яго выдатную прадмову, а па-другое, менавіта за яго грошы Статут быў надрукаваны ў віленскай друкарні братоў Мамонічаў. Друкаваныя асобнікі Статута мусілі мець ва ўсіх судах ВКЛ, а акрамя таго, набывалі іх і прыватныя асобы, калі ім дазвалялі сродкі.

Важна таксама, што ў сваёй прадмове Леў Сапега падкрэсліваў неабходнасць вядзення справаводства менавіта на старабеларускай мове: "Не обчым якым языком, але своим власным права списанные маем", што спрыяла супрацьдзеянню паланізацыі і дазволіла на даўжэйшы час захаваць нацыянальную самасвядомасць продкаў сучасных беларусаў. Адметна, што, нягледзячы на ўтварэнне ў 1569 годзе Рэчы Паспалітай, ВКЛ захавала сваё ўласнае заканадаўства і актыўна супрацьстаяла спробам яго ўніфікацыі з польскай прававой сістэмай.

Таксама варта адзначыць, што трэці Статут выкарыстоўваўся на беларускіх землях нават пасля таго, як Вялікае Княства Літоўскае спыніла сваё існаванне, на асобных тэрыторыях Расійскай імперыі — ажно да 1840 года. Дзякуючы таму, што Статут перакладаўся на розныя мовы, ён таксама аказаў істотны ўплыў на развіццё прававых сістэм многіх краін Еўропы.

ЗАДАЧЫ НА БУДУЧЫНЮ

Хаця ўплыў Статутаў ВКЛ на прававую думку даўно агульнапрызнаны і даволі шырока даследаваны, тым не менш перад айчыннымі навукоўцамі ды выдаўцамі яшчэ стаіць нямала важных задач па папулярызацыі гэтых каштоўных гістарычных крыніц. Ні першы, ні другі Статуты дагэтуль не перакладзеныя на сучасныя беларускую альбо рускую мовы — а такі пераклад дазволіў бы азнаёміцца з імі шырокаму колу чытачоў і значна спрыяў бы замацаванню важнасці гэтых дакументаў у грамадскай свядомасці. Не існуе, на жаль, таксама і беларускіх факсімільных перавыданняў усіх трох гэтых кодэксаў — а яны проста неабходныя для іх далейшага сур'ёзнага навуковага вывучэння.

Без даследавання такіх гістарычных крыніц, як Статуты Вялікага Княства Літоўскага, немагчымае асэнсаванне ўсяго шляху развіцця і эвалюцыі прававой сістэмы на беларускіх землях. Як правобразы канстытуцыйных актаў, яны займаюць у айчыннай гісторыі права такое ж неад'емнае месца, як і бліжэйшыя да нас па часе Канстытуцыі БССР і, вядома ж, незалежнай Беларусі. Працэс удасканалення заканадаўства няспынны, як і сама хада гісторыі, таму сёння, дбаючы аб будучыні, надзвычай важна не забываць і аб уроках мінулага ды дасягненнях нашых продкаў, вучыцца на іх прыкладах і пераймаць найлепшае.

Антон РУДАК

22 чэрвеня 2004 года ў цэнтры Гродна ў прысутнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі быў урачыста адкрыты мемарыяльны ансамбль у гонар савецкіх воінаў-пагранічнікаў, якія ў чэрвені 1941 года на тэрыторыі БССР — заходняй дзяржаўнай мяжы Савецкага Саюза – прынялі на сябе першыя ўдары фашысцкай зграі.нялі на сябе першыя ўдары фашысцкай зграі.

Мемарыял у Гродна

Яны былі першымі...

Подзвіг пагранічнікаў на заходніх рубяжах СССР у 1941-м

З 19 700 асабовага складу чатырох пагранічных атрадаў Беларускай пагранічнай акругі каля 16 тысяч байцоў загінулі ў няроўным баі, некаторыя з іх да гэтага часу лічацца зніклымі без весткі, але ніводны не адступіў ні на крок. Заўважу, што ў кожным пагранатрадзе ў сярэднім было ад 1400 да 2200 чалавек.

На жаль, пра падзеі першых дзён вайны (ды і наогул пра ўсю вайну) сённяшняе пакаленне моладзі ведае, мякка кажучы, даволі павярхоўна, галоўным чынам па сумнеўных, няпэўных блокбастарах і тэлесерыялах, бо кнігі, заснаваныя на праўдзе фактаў, і дакументальныя матэрыялы на гэтую тэму мала хто зараз чытае. Да таго ж, ігнаруючы аб'ектыўнасць такіх фактаў, у некаторых краінах палітыкамі вельмі вольна перапісваецца гісторыя, звязаная з Другой сусветнай вайной і ў прыватнасці з першымі трагічнымі гадзінамі, днямі і месяцамі нашай Вялікай Айчыннай.

Як захаваць, не згубіць Праўду? Час няўмольны: носьбітаў — удзельнікаў і сведак вялікай драмы сорак першага — у жывых засталося зусім мала. І што рабіць? Вось і думаеш, што адна надзея на моладзь: калі не яна, дык хто панясе далей нязгасны факел Памяці? "Тут і цяпер" помніць тых, хто стварыў бессмяротны подзвіг у імя твайго ж жыцця, у імя будучай свабоднай і мірнай Бацькаўшчыны! Праецыраваць урокі гісторыі на сябе, каб не парушыць чыстыя запаветы «жывых і мёртвых», — так гучыць сучасны пасыл маладой незалежнай Рэспублікі Беларусь да народаў усёй планеты. І ў гэтым кантэксце, сярод усяго іншага, манументы і буйныя мемарыялы, узведзеныя на нашай зямлі, заўсёды былі моцным акумулятарам чалавечых арыенціраў на шляху ў Заўтра — без войнаў, рэвалюцый, гвалту, сацыяльных, эканамічных, культурных і рэлігійных узрушэнняў. У ліку такіх духоўных святынь — і Гродзенскі мемарыял, дарэчы, першы на тэрыторыі былога СССР, створаны ў гонар герояў-пагранічнікаў 41-га года...

У БОЙ ІДУЦЬ НЕ ТОЛЬКІ «СТАРЫЯ»

Але перш чым расказаць уласна пра помнік, прыадкрыю некаторыя старонкі-факты пра тое, што тады, 22 чэрвеня, адбылося на нашай заходняй дзяржаўнай мяжы. Перад вайной яе захоўвалі заставы чатырох атрадаў Беларускай пагранічнай акругі: 86-га (Аўгустоўскага), 87-га (Ламжынскага), 88-га (Шапятоўскага) і 17-га Чырванасцяжнага (Брэсцкага). Узбраенне кожнай заставы даволі сціплае: вінтоўкі, ручныя гранаты, у тым ліку па 10 супрацьтанкавых гранат на заставу, 1-2 станковыя кулямёты "Максім". Сувязь — толькі правадная, якая, на жаль, была ў большасці пашкоджаная дыверсантамі яшчэ да агульнага наступлення ворага.

У першыя хвіліны вайны, нароўні з вопытнымі "старымі", бой на напрамку галоўнага ўдару фашысцкай групы "Цэнтр" прынялі і пагранічныя нарады навабранцаў, што заступілі на службу ў апошні мірны суботні дзень — 21 чэрвеня. У 19:00 на ўсіх пагранічных заставах праводзіўся традыцыйны рытуал прызначэння пагранічнікаў на ахову граніцы — так званы баявы разлік. Але ніхто не мог ведаць, што кожная застава праз некалькі гадзін стане маленькай крэпасцю, якую вораг не здолеў узяць, пакуль заставаўся жывым хаця б адзін баец, і што для абсалютнай большасці з іх гэты дзень будзе апошнім...

Прывяду некалькі прыкладаў гераізму пагранічнікаў у першыя гадзіны вайны. На паўночна-заходнім напрамку ад мястэчка Сапоцкін дыслацыравалася 3-я застава 86-га Аўгустоўскага пагранатрада, якую ўзначальваў лейтэнант Віктар Усаў. Мяжа праходзіла па рэчках Валкушанка і Чорная Ганча. На заставе знаходзіліся ўсяго 32 байцы. Немцы менавіта ў гэтым месцы, у раёне вёскі Вулька-Даргунская, акрэслілі прарыў граніцы. І на досвітку, у пяць гадзін, пачалося наступленне. Але за паўтары гадзіны да таго Усаў ужо падняў заставу з загадам тэрмінова ўмацаваць тры дугападобныя траншэі поўнага профілю, падрыхтаваныя яшчэ да вайны. У гэтых акопах пагранічнікі і занялі кругавую абарону. Першую шалёную атаку адбілі, потым другую, трэцюю... шостую. Неслі страты. Атрымаўшы пяць раненняў, Усаў працягваў камандаваць і змагацца да апошняга патрона. Застава палегла праз шэсць гадзін бесперапынных баёў з нямецкай пяхотай, узмоцненай танкамі і мінамётамі. Усё было скончана пасля таго, як фашысты высунулі на прамую наводку процітанкавую гармату...

«СМЕРТЬЮ СМЕРЦЬ ПОПРАВ...»

Праз адзінаццаць год на месцы гібелі пагранічнікаў адбыліся раскопкі. Удалося знайсці частку астанкаў байцоў, і ў іх ліку — лейтэнанта Усава са снайперскай вінтоўкай у руцэ. Пахавалі ў брацкай магіле ля заставы, пазней названай імем яе камандзіра, — у шасці кіламетрах на захад ад пасёлка Сапоцкін Гродзенскага раёна. Будучы дзевяцікласнікам гродзенскай школы №7, я са сваім школьным сябрам Валодзем Арловым, класным кіраўніком Львом Клейнам і іншымі хлопцамі пабываў у гэтых месцах, дзе ўпершыню даведаўся пра тое, што тут адбывалася ў чэрвені 41-га... У сярэдзіне 60-х вёску Вулька-Даргунскую перайменавалі ў вёску Усава. Імя Віктара Усава стала насіць і Гродзенская сярэдняя школа №3, тут жа яму ўсталяваны і помнік. А званне Героя Савецкага Саюза мужнаму пагранічніку было прысвоена пасмяротна 6 мая 1965 года...

...У гэтыя світальныя гадзіны 22 чэрвеня храбра білася і 1-я застава 86-га Аўгустоўскага пагранатрада старшага лейтэнанта Аляксандра Сівачова. Амаль дзесяць гадзін застава стрымлівала ворага. Маючы толькі стралковую зброю, кулямёт "Максім" і гранаты, пагранічнікі пад моцным артабстрэлам, тым не менш, змаглі знішчыць да 60 гітлераўцаў і спаліць тры танкеткі. Цяжка паранены камандзір заставы працягваў да апошняй хвіліны жыцця камандаваць боем...

4-я застава старшага лейтэнанта Феадосія Кірычэнкі трымалася да вечара 22 чэрвеня. 7-я застава лейтэнанта Аляксандра Шацкага, прабіваючы акружэнне, кінулася ў штыкавую контратаку і, перамагаючы збянтэжанага ворага, змагла прарваць варожае кола і позна ўвечары злучыцца з байцамі 27-й стралковай дывізіі. Але такія ўдалыя выпадкі былі адзінкавыя.

Баец 2-й заставы 17-га Чырвонасцяжнага пагранічнага атрада яфрэйтар Павел Капінос са станковым кулямётам, гранатамі і вінтоўкай з аптычным прыцэлам на працягу дзесяці гадзін адбіваў атакі ворага, пакуль у яго не скончыліся боепрыпасы. Выпадак унікальны, бо ён, апошні, хто застаўся жывы пасля гібелі баявога разліку, змог не толькі знішчыць больш за паўсотні фашыстаў, але і на нейкі час спыніць наступленне цэлага батальёна гітлераўцаў на стратэгічна важную вёску Навасёлкі. Зразумела, што ў першыя дні вайны прадстаўленне да ўзнагарод ніхто не складаў. Не да таго было. Ну а потым, пасля Перамогі, з-за бюракратычных і іншых цяганін не заўсёды ўзнагароды знаходзілі сапраўдных герояў. Аднак, на мой погляд, подзвіг не павінен мець тэрмін даўніны, як не павінна яго быць і ў Памяці.

Менавіта тут, у цэнтры ансамбля, і размяшчаецца дамінанта ўсяго велічнага твора — скульптурная кампазіцыя "Граніца ў агні", выразная сваімі пластычнымі рытмамі, вострай дынамікай і дакладнай прапрацоўкай дэталяў...

НАВЕЧНА ЗАСТЫГЛЫЯ Ў БРОНЗЕ

Яркіх прыкладаў гераічных подзвігаў абаронцаў дзяржаўнай мяжы на заходніх рубяжах Беларусі ў першыя гадзіны вайны можна прывесці шмат: яны захаваліся і ва ўспамінах тых нямногіх ветэранаў-пагранічнікаў, якія выжылі, і ў архіўных дакументах, і ў ваеннай хроніцы, і ў дакументальных кнігах-даследаваннях. А потым, пачынаючы з 1960-х, надышоў час захоўваць падобныя подзвігі і ў лепшых творах манументальнага мастацтва. І першай "ластаўкай" у рэалізацыі гэтай велічнай праграмы па ўвекавечанні памяці герояў стаў мемарыяльны ансамбль "Брэсцкая крэпасць-герой", пра які газета "Культура" падрабязна пісала не аднойчы.

Работа над мемарыялам савецкім героям-пагранічнікам для Гродна пачалася ў пачатку 2000-х гадоў. Я быў сведкам таго, як у творчай майстэрні вядомага скульптара і майго сябра Генадзя Буралкіна распрацоўваўся эскізны праект, а потым і прамежкавая рабочая мадэль будучага помніка. Менавіта яму, Генадзю Васільевічу, і вопытнаму архітэктару Станіславу Федчанку, па прапанове духоўнага кіраўніка праекта, тагачаснага старшыні Дзяржаўнага камітэта пагранічных войск Рэспублікі Беларусь, генерал-лейтэнанта Аляксандра Паўлоўскага, было даручана рэалізаваць гэты знакавы для краіны манументальны твор. Што знамянальна, мемарыял стаў сапраўды народным помнікам, бо быў збудаваны на асабістыя ахвяраванні пагранічнікаў Беларусі, Расіі, Казахстана, Кіргізіі, Малдовы, іншых грамадзян і арганізацый, пра што сведчыць адпаведны надпіс на бронзавай дошцы.

Цэнтральная вось мемарыяльнага ансамбля праходзіць пад вуглом у 45 градусаў у адносінах да перакрыжавання дзвюх вуліц — Савецкіх Пагранічнікаў і Касманаўта Паўла Паповіча. Цудоўна задуманы архітэктурны складнік помніка. Прыўзнятая над зямлёй пляцоўка ў рытмічным абрамленні кветачніц выглядае як своеасаблівы магутны подыум, на які вядуць гранітныя прыступкі, а па абодвух баках ад восі размяшчаюцца дзве групы па сем сімвалічных магіл. Яны выкананы з гранітных камянёў з нахіленымі паліраванымі плоскасцямі, на кожнай з якіх бронзавымі літарамі пазначаны назвы 14-ці загінулых пагранічных застаў. На плітах ля падножжа гэтага суровага, па-сапраўднаму цэльнага, без залішняй літаратурнасці манументальнага твора высечаны назвы пагранічных часцей і падраздзяленняў, якія першымі ў Вялікай Айчыннай вайне прынялі бой з германскімі полчышчамі. І надпіс: «Загінуўшым, але непераможаным воінам Беларускай пагранічнай акругі». Навокал 15 слупоў Дзяржаўнай мяжы СССР.

Менавіта тут, у цэнтры ансамбля, і размяшчаецца дамінанта ўсяго велічнага твора — скульптурная кампазіцыя "Граніца ў агні", выразная сваімі пластычнымі рытмамі, вострай дынамікай і дакладнай прапрацоўкай дэталяў. Вельмі прыцягальныя па сваёй натхнёнасці абагульненыя вобразы камандзіра заставы з біноклем на грудзях, сяржанта з аўтаматам і радавога пагранічніка, які моцна сціскае вінтоўку са штыком. Так і стаяць плячо ў плячо байцы, навечна застыглыя ў бронзе, напамінаючы нам, сучаснікам, пра тое, як менавіта яны, ахвяруючы сабой, зрабілі першы пераможны крок на вогненным шляху, які прывёў да гістарычнай майскай Вясны 45-га.

Барыс КРЭПАК

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66

■ **Пастаянная экспазіцыя**.
■ Выстава **"Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны"**. Да 11 красавіка.
■ Выстаўка **"Лічбы на сэрцы"**, прымеркаваная да 100-годдзя з дня нараджэння М.А. Савіцкага. Да 19 красавіка.
■ Выстава **"Аляксандр Дзітлаў. Да 110-годдзя з дня нараджэння"**. Да 21 кастрычніка.
■ Майстар-класы ў "Музеі для дзяцей" – **пластылінавы жывапіс і малюнак у тэхніцы граттаж** (серада – нядзеля з 10.00 да 17.00)

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Новы выставачны корпус на вул. К. Маркса, 24

■ Выстава **"В.К. Бялыніцкі-Біруля. Да 150-годдзя мастака"**. Да 10 красавіка.
■ Выстава **"Анатоль Анікейчык. Агонь душы і сэрца жар"**. Да 17 красавіка.

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)

■ **Пастаянныя экспазіцыі.**
■ Творчая сустрэча з Нінай Пілюзінай у рамках выставы **"Разам з сонцам"**. Наведаць мерапрыемства можна па білеце ў музей 10 красавіка а 14-й гадзіне.
■ Выставачны праект **"Ніна Пілюзіна. Разам з сонцам"**. Да 17 красавіка.
■ Выстава **"Майстры лінагравюры"**. Да 17 красавіка.
■ Выстава **"Памяць народа. Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прымеркаваная да Года гістарычнай памяці. Да 17 красавіка.
■ Сумесны выставачны праект Мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Музея гісторыі горада Мінска і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **"Міхаіл Савіцкі. Да 100-годдзя з дня нараджэння"**. Да 18 красавіка.
■ Выстава **"Пад знакам рыбы. Жывапіс Глеба Отчыка"**. Месца знаходжання – Арт-кафэ. Да 19 красавіка.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 358 88 78

■ **Пастаянныя экспазіцыі.**
■ Тэматычная праграма **"Ад Даравальнай нядзелі да Вялікадня"**. Групы фарміруюцца на папярэднім запісе. Да 23 красавіка.
■ Спектакль тэатра ценяў **"Сядзібны прывід"**. Па папярэднім запісе кожную суботу а 12-й і 16-й гадзінах. Для арганізаваных груп кожную гадзіну штодзённа.
■ Квэст-гульня **"Таямніцы старажытнай сядзібы"**.
■ Сюжэтна-гульнявая праграма **"Метамарфозы ў сядзібным доме"**. Удзельнікі пазнаёмяцца з традыцыямі маскарадных паказаў XVIII стагоддзя і – з дапамогай інтэрактыву – з экспанатамі музейнай калекцыі.
■ Сюжэтна-гульнявая праграма **"Мова веера"**. Удзельнікі пазнаёмяцца з культурай веера розных часоў і народаў, навучацца мове веерных знакаў і мастацтву зносін.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69

■ **Пастаянная экспазіцыя.**

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл. 8 (0222) 65 07 57, 65 88 00

■ **Пастаянная экспазіцыя.**

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47 Тэл.: 242-78-14

■ Выставачны праект **"Зачараванні Дэлакруа"**. Да 29 мая.

г. Мінск, вул. Някрасава, 3. Тэл.: 399-09-78

■ Выставачны праект **"Джаз! Каты! Вясна!"**. Да 24 красавіка.
■ Выстава ў рамках IV Міжнароднага фестывалю дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **"ТэкСтыльны букет"**. Да 26 чэрвеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: +375177020602, 20660, +375295518051, +375291903149

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці: г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1.

■ Выстава жывапісу Алега Курашова **"Ах, март, и я дыхание прячу..."**. Да 16 мая.

Палацавы ансамбль:
■ Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
■ Выставачны праект Максіма Петруля **"deКанструкцыя"**. Да 3 ліпеня. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
■ Выстава-атракцыён па матывах творчасці ветэрана беларускай анімацыі, мастака і рэжысёра Алы Мацюшэўскай **"Час — хуткая рака"** ў рамках мерапрыемстваў па правядзенні Года гістарычнай памяці. Да 30 чэрвеня.
■ Віртуальная выстава **"Нясвіж – здабытак сусветнай культуры"**.
■ Віртуальная выстава Паўла Татарнікава **"Магнацкія двары і замкі Беларусі"**.

Ратуша:
Пастаянная экспазіцыя:
■ **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII – 1-й палове XIX стст."**
■ **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі падзеі"**.
■ Калекцыя гадзіннікаў XIX –XX стст **"Культура часу"**.
З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы:

■ Лекцыя-прэзентацыя **"Генацыд – трагедыя беларускага народа"**. 11 красавіка – *Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў*. Наведванне лекцыі – бясплатнае.
■ Экскурсія з элементамі гістарычнай гульні **"Музейныя вандроўкі"**.
■ Квэст **"Карта сямі каралеўстваў"**.
■ **"Дзень нараджэння ў Ратушы"**. Група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў.
■ **"Дзень нараджэння з Карамелькай (Лол Пчолкай)"**. Група ад 4 да 10 чалавек ад 4 да 12 гадоў.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8-01596) 2 82 90, (8-01596) 2 82 70

■ **Пастаянная экспазіцыя**.
■ Квэст **"Белы слон"**. 9 красавіка. Пачатак у 15.30. Даведкі па тэлефонах: +375159636232, +375159636270 (з 9.00 да 18.00).
■ Выстава **"Белая зброя краін свету"**. 1-ы адсек Паўночнага корпуса Мірскага замка. Да 19 чэрвеня.
■ Віртуальныя экскурсіі па выставах: **"Аб'ядноўваючы прастору і час: беларускія землі на картах XVI – XVIII стст."**; **"На адным полі ваяры"**.
■ **Аглядныя і тэматычныя экскурсіі**.
■ **Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых**.
■ Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"** (група ад 2 да 5 чалавек).
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэсту для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Тэматычную экскурсію **"Падарожжа ў часе"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту па асноўнай музейнай экспазіцыі.
■ Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"**; **"Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."**; **Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."**; **"Печы з каробкавай кафлі XVI – XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1. Тэл.: +375 (17) 2431041 (каса), +375 (17) 361 54 93

■ **9 — "Царская нявеста"** (опера ў 2-х дзеях) М. Рымскага-Корсака (12+). Дырыжор — Мікалай Калядка. Пачатак у 19.00.
■ **10 — "Канёк-Гарбунок"** (балет у двух дзеях) Р. Шчадрына (6+). **ПРЭМ'ЕРА**. Дырыжор — Мікалай Калядка. Пачатак у 11.00.
■ **10 — "Канёк-Гарбунок"** (балет у двух дзеях) Р. Шчадрына (6+). **ПРЭМ'ЕРА*.** Дырыжор — Мікалай Калядка. Пачатак у 18.00.
■ **12 — "Макбэт"** (опера ў 3-х дзеях) Д. Вердзі (16+). Дырыжор — Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.
■ **13 — "Жыззэль, або Вілісы"** (балет у 2-х дзеях) А. Адана (12+). Дырыжор — Мікалай Калядка. Пачатак у 19.00.
■ **13 — Канцэрт "Маё сэрца належыць табе"** (12+). *З удзелам трыа "Глорыя"*. Пачатак у 19.30.
■ **15 — "Пэр Гюнт"** (балет у 2-х дзеях) Э. Грыгі (12+). Дырыжор — Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.
■ **16 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж. Бізэ (12+). Дырыжор — Мікалай Калядка. Пачатак у 19.00.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, д. 2. Тэл.: +375 212 66-90-77 (каса)

■ **9 — "Аладзін"** (казка на 2 дзеі паводле персідскага эпасу "Тысяча і адна ноч") (6+). Пачатак у 11.00.
■ **10 — "Бука"** — (казка-гульня на 2 дзеі) М.Супоніна (3+). Пачатак у 11.00.
■ **16 — "Насарог і Жырафа"** (гісторыя незвычайнага сяброўства на 2 дзеі) Х. Гюнтэра (4+). Пачатак у 11.00.

Новы замак у Гродна. *Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ*

Увага! Аб'ява!*

Заслуженный коллектив Республики Беларусь Президентский оркестр Республики Беларусь

объявляет конкурс на замещение вакантной должности:

– артист эстрадно-симфонического оркестра – ударные инструменты – 1 человек.

В конкурсе могут принять участие **музыканты с высшим и средним специальным образованием, которые владеют необходимыми навыками и практикой игры в оркестровом коллективе**.
Желающие принять участие в конкурсе, предоставляют письменное заявление в **администрацию Президентского оркестра Республики Беларусь.**
К заявлению прилагаются:
1. личный листок по учёту кадров;
2. автобиография;
3. копия диплома о высшем и средне-специальном образовании;
4. копия паспорта;
5. копия трудовой книжки;
6. фотография для документов 3*4;
7. программа выступления до 15 минут: крупная форма и пьеса.

Конкурсная комиссия имеет право предложить участникам прослушивания нотный материал для чтения с листа.
Участники конкурса подают вышеназванные документы с пометкой
"На конкурс в администрацию Президентского оркестра Республики Беларусь"
до 06.05.2022.

Дополнительная информация по телефонам:
229 90 08, 229 90 04.

Дзяржаўная ўстанова "Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча"

аб'яўляе паўторны конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады:

– мастацкі кіраўнік.

Кваліфікацыйныя патрабаванні да ўдзельнікаў:
– вышэйшая прафесійная адукацыя ў сферы культуры і мастацтва;
– стаж творчай працы (у тым ліку кіраўніком харавога калектыву або хормайстрам) не менш за 5 гадоў.
Кандыдаты падаюць заяўкі на імя дырэктара
да 4 мая 2022 года.
Для тлумачэння ўзніклых пытанняў звяртацца да дырэктара ўстановы Лагуткі Марата Вікенцьевіча па тэлефонах:
8 (017) 3562904, 8 (029) 6014354, 8 (029) 5589329.

Чытайце ў наступным нумары:

"Ролы па-радзівілаўску"
Ці дарэчы японская кухня і шашлык у магнацкіх замках і старасвецкіх сядзібах?

Вада з партызанскай крынічкі
Якія мясціны ў Беларусі варта наведаць, каб адчуць гераізм і трагедыю нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

КУЛЬТУРА

Пераможца 2006 г. Гран-пры 2010 г.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч. Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.

Прыёмная: (017) 334 57 41. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.

Галоўны рэдактар — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; Адказны сакратар — МАЛІНОЎСКАЯ Галіна; рэдактар аддзела: Яўген РАПН; аглядальнікі рэдакцыі: Надзея БУНЦЭВІЧ, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЁЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯЖЕВІЧ, Даніїл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ; мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД.

Сайт: www.kimpress.by.

E-mail: kultura@tut.by.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2022.

Наклад 3101. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 08.04.2022 у 18:00. Замова №777. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.
З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сервіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").